WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 ЛІПЕНЯ 2010 г.
АЎТОРАК
№ 139
(26747)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

**Прамая лінія**

## КАЛІ ЯЗВА АБВАСТРЫЛАСЯ І «ДАСТАЎ» ПАНКРЭАТЫТ...

На нашай чарговай «прамой лініі» мы пагаворым пра хваробы страўнікава-кішачнага тракту, такія як язвы, гастрыты, панкрэатыты і іншыя. Вы зможаце задаць пытанні **дацэнту 2-й кафедры ўнутраных хваробаў Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта, кандыдату медыцынскіх навук, урачу-гастраэнтэролагу Мікалаю Валянцінавічу КАПРАЛАВУ,** а таксама **дацэнту гэтай жа кафедры, кандыдату медыцынскіх навук, урачу-гастраэнтэролагу Ірыне Аляксандраўне ШАЛАМІЦКАЙ.**

***«Прамая лінія» адбудзецца 22 ліпеня, у чацвер, з 14.00 да 15.30 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 287 18 36 і 287 18 29.***

## ВАГАННІ КУРСУ БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ ДА КОШЫКА ВАЛЮТ ДА КАНЦА ГОДА МОГУЦЬ ЗАСТАВАЦЦА Ў КАЛІДОРЫ +/- 2-3 ПРАЦЭНТЫ

**У Беларусі існуюць усе неабходныя ўмовы для таго, каб ваганні курсу беларускага рубля да кошыка валют да канца года заставаліся ў калідоры +/- 2-3 працэнты. Аб гэтым Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку далажыў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Як адзначыў Пётр Пракаповіч, курс беларускага рубля да кошыка валют на працягу першага паўгоддзя заставаўся стабільным, не было яго рэзкіх ваганняў, і ў цэлым па выніках паўгоддзя беларускі рубель умацаваўся да кошыка валют на 1,1 працэнта.

Паводле чаканняў Нацбанка, да канца года курс беларускага рубля будзе заставацца стабільным.

Кіраўнік галоўнага банка краіны таксама далажыў, што золатавалютныя рэзервы ў нацыянальным вызначэнні на 1 ліпеня перавысілі $6 млрд.

## Завершана распрацоўка праекта новай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Беларусі

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў 19 ліпеня рабочую сустрэчу з дзяржаўным сакратаром Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь Леанідам Мальцавым.**

Кіраўніку дзяржавы было даложана аб завяршэнні распрацоўкі праекта новай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Беларусі. Па сутнасці, дакумент — лагічнае прадаўжэнне дзеючай канцэпцыі, аднак у ім улічаны новыя рэаліі і асаблівасці абстаноўкі, якая цяпер складваецца ў рэспубліцы і вакол яе.

Калі ў дзеючай канцэпцыі нацыянальная бяспека разглядаецца як стан абароненасці асобы, грамадства і дзяржавы, то ў новай гэта паняцце пашырана і нацыянальная бяспека разглядаецца як стан абароненасці нацыянальных інтарэсаў. У сваю чаргу, нацыянальныя інтарэсы — гэта гармонія інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы. Гэта значыць, з'яўляецца не толькі разуменне абароненасці, але і гарманічнага развіцця і ўліку гэтых інтарэсаў. Акрамя таго, у новай канцэпцыі паняцце «небяспека» мае тры ўзроўні: рызыка, выклік і пагроза.

У цэлым дакумент больш сістэмна вызначае работу дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый і грамадзян па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі краіны.

Праект новай канцэпцыі будзе разасланы членам Савета Бяспекі для вывучэння, пасля чаго будзе прадстаўлены на пасяджэнні Савета Бяспекі. Такім чынам, прыняцця дакумента можна чакаць у канцы жніўня — пачатку верасня гэтага года.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

**Тваё правы**

## НА «ЗАМЕНУ» ТОЛЬКІ З ДАГАВОРАМ

Сяргей ГРЫБ

**ЛІПЕНЬ-ЖНІВЕНЬ традыцыйна былі часам масавых водпускаў, прычым не сакрэт, што менавіта ў гэты час у арганізацыях пачынаюць узнікаць пэўныя «кадравыя прагалы». Вырашаюць гэту праблему па-рознаму, і калі недзе праводзіцца звычайнае «пераразмеркаванне» абавязкаў, то ў іншых месцах на час адсутнасці адпускніка запрашаюць новага чалавека. Да слова, апошняя практыка — даволі папулярная. Між тым падчас працаўладкавання «на замену» ўзнікаюць свае нюансы, і разабрацца з імі мы паспрабуем з дапамогай загадчыка юрыдычнай кансультацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзіміра Іванавіча ШЭЛКОВІЧА.**

### АФАРМЛЕННЕ ПА ЗВЫЧАЙНЫХ ПРАВІЛАХ

Перш-наперш варта заўважыць: з работнікам, які ўладкоўваецца на месца адпускніка, у любым выпадку заключаецца працоўны дагавор. Пры гэтым дагавор тэрміновы — да дня, які папярэднічае выхаду работніка асноўнага.

— Пры афармленні «на замену» дзейнічаюць звычайныя правілы: наймальнік абавязаны запатрабаваць, а чалавек падаць пэўны пакет дакументаў, — адзначае Уладзімір Шэлковіч. — У прыватнасці, у гэты пакет уваходзяць пашпарт ці іншае пасведчанне асобы, працоўная кніжка, дакументы аб адукацыі, а ў асобных выпадках — таксама воінскі білет, заключэнне аб стане здароўя інваліда, дэкларацыя аб даходах. Прычым калі той жа працоўнай кніжкі ў чалавека няма, то яе павінны завесці — нягледзячы на непрацяглы час працаўладкавання.

### ХТО ЗАПЛАЦІЦЬ ЗА САНКНІЖКУ?

Патрабаваць ад прэтэндэнта на вакансію якія-небудзь іншыя дакументы, і ў тым ліку «рэкамендацыйныя пісьмы», заканадаўства забараняе. Аднак вядома, што часам для пачатку выканання сваіх абавязкаў работніку неабходна мець заключэнне медыкаў ці тую ж санітарную кніжку. Хто ў такім разе павінен аплачваць медагляд?

СТАР. 2

белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

**СООБЩАЕТ, ЧТО В СООТВЕТСТВИИ С РЕШЕНИЕМ НАБЛЮДАТЕЛЬНОГО СОВЕТА 26 ИЮЛЯ 2010 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ**

220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

Повестка дня

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Белагропромбанк» на 125,0 млрд рублей.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 16 июля 2010 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк»: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров в рабочие дни ОАО «Белагропромбанк» с 9.00 до 17.00.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 22 июля 2010 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 5 августа 2010 года.

**Телефоны для справок: 8(017) 229 64 54, 229 63 24.**

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь*

ISSN 1990 - 763X

Фотарэпартаж

## БЕЛАКАЧАННАЯ СТАЛІЦА



15-гадовы жыхар вёскі Чырвоны Бор Жыткавіцкага раёна Уладзімір КІРШУН на ўборцы капусты ў фермерскай гаспадарцы Івана Грыба.

САПРАЎДНАЯ капусная рэчка... «бяжыць» праз Альшаны ці не з усіх навакольных палёў. З раніцы да вечара ў двор фермерскай гаспадаркі спяшаюцца трактарныя цягнікі, з верхам загружаныя белакачаннай прыгажуняй. І гэта яшчэ не разгар, не пік капуснага сезона, які ў Альшанах доўжыцца да сярэдзіны кастрычніка. Мяне ўразілі лічбы, прыведзеныя палешуком-фермерам Іванам Грыбам: штодзень з ягоных капусных палеткаў у розныя бакі краіны і асабліва ў расійскія гарады-монстры Маскву і Санкт-Пецярбург вывозіцца па 50 і болей тон ранняй капусты. Штодзень!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР. 2

## РЭАЛЬНАЯ ЗАРПЛАТА ЎЗРАСЛА НА 2,9 %

**Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі (акрамя суб'ектаў малога прадпрымальніцтва недзяржаўнай формы ўласнасці) у студзені—маі гэтага года склала Br1 млн 78,2 тыс., паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Майская сярэдняя зарплата павялічылася ў параўнанні з красавіцкай на 3,7 працэнта (на Br41,6 тыс.) і склала Br1 млн 158,4 тыс. Рэальная заработная плата (разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэнаў на тавары і паслугі) у студзені—маі гэтага года ў параўнанні са студзенем—маем 2009 года павялічылася на 6,9 працэнта. Гэты паказчык у маі ў параўнанні з красавікам 2010 года ўзрос на 2,9 працэнта.

## КОЛЬКАСЦЬ БЕСПРАЦОЎНЫХ ЗНІЗІЛАСЯ ДА 38,9 ТЫС. ЧАЛАВЕК

Колькасць беспрацоўных, зарэгістраваных у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне на 1 ліпеня гэтага года склала 38,9 тыс. чалавек. Як паведамілі **БЕЛТА** ў Нацыянальным статыстычным камітэце, гэта на 6,6 працэнта менш, чым год таму, і на 4,7 працэнта менш, чым на 1 чэрвеня 2010 года.

Паводле ацэнкі, зарэгістраванае беспрацоўе ў рэспубліцы на канец чэрвеня гэтага года знізілася да 0,8 працэнта ад эканамічна актыўнага насельніцтва краіны (год таму гэты паказчык складаў 0,9 працэнта). Узровень беспрацоўя ў Віцебскай вобласці склаў 1,1 працэнта, у Гродзенскай, Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях — 1 працэнт, у Мінскай вобласці — 0,8 працэнта, у горадзе Мінску — 0,4 працэнта.

У студзені—чэрвені 2010 года на ўлік было пастаўлена 166,8 тыс. грамадзян, якія звярнуліся па дапамогу ў працаўладкаванні. З іх прызнана беспрацоўнымі 108,2 тыс. чалавек (64,9 працэнта ад колькасці звернутых). Дарэчы, сярод рэгіёнаў краіны больш за ўсё беспрацоўных у чэрвені было зарэгістравана ў Віцебскай і Мінскай абласцях (па 2,7 тыс. чалавек), менш за ўсё — у Мінску (1,3 тыс.). За студзень—чэрвень у краіне працаўладкавана 105,6 тыс. чалавек, у тым ліку 70,7 тыс. беспрацоўных (67 працэнтаў усіх працаўладкаваных).

## Мікалай Ладуцька назначаны членам Савета Рэспублікі

Старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Мікалай Ладуцька назначаны членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання. Адпаведны ўказ 19 ліпеня падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Мікалай Ладуцька назначаны членам Савета Рэспублікі ў адпаведнасці з ч.2 арт.91 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## НАВАЛЬНІЧНЫЯ ДАЖДЖЫ ПЛЮС ТРАПІЧНАЯ СПЯКОТА

**Другі тыдзень запар паўсюды ў Беларусі трымаецца субтрапічнае надвор'е. З панядзелка гарачыня крыху адпусціла, але ўжо з чацвярга да нас зноў завітае афрыканская спякота, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Толькі сёння ўдзень на паўднёвым усходзе чакаюцца кароткачасовыя дажджы рознай інтэнсіўнасці, у асобных раёнах навальніцы. Захаваецца паўночна-ўсходні вецер. Тэмпература ўдзень 24—29, на паўднёвым усходзе — да 30—33 градусаў. У сераду заходні антыцыклон будзе рухацца ўздоўж паўночнай мяжы краіны, таму дажджы з навальніцамі і трыццаціградусная спякота ўсталююцца на поўдні Беларусі. На поўначы ўначы — 13—16, удзень — 26—29 градусаў. Прагназуецца, што 22 ліпеня ў многіх раёнах пройдуць навальнічныя дажджы, пры навальніцах парывісты вецер. Тэмпература ўначы 16—22, удзень на захадзе — 27—30, а на ўсходнюю палову краіны зноў завітае вельмі гарачае надвор'е — да 31—34 градусаў. У пятніцу і суботу ўжо паўсюдна па краіне пачне гаспадарыць вільготнае і спякотнае субтрапічнае паветра. У асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы — 17—24, удзень — 29—34, месцамі будзе прыпякаць да 35—36 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## СЁМЫ РАЗ СЕРАБРО ЧЭМПІЯНАТУ ЕЎРОПЫ

Зборная Беларусі па мотаболе сёмы раз стала сярэбраным прызёрам чэмпіянату Еўропы. У паядынку за золата, які прайшоў у Пінску, беларусы саступілі расіянам з лікам 3:11, паведамляе **БЕЛТА**. Бронзавымі прызёрамі сталі французы, якія ў матчы за 3-е месца адолелі немцаў — 6:3. Зборная Беларусі ўдзельнічае ў чэмпіянатах Еўропы з 1994 года. У 2004 годзе беларусы заваявалі золата, а ў 1995, 1998, 2001, 2007, 2008, 2009 і 2010 гадах — серабро.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)
ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «АВТОМАГИСТРАЛЬ» (ПРОДАВЕЦ)
**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**
по продаже здания операторской АЗС (инв. № 310/С-34021), об. пл. 15,8 кв.м, расположенного по адресу: Гомельская область, Гомельский район, вблизи д. Сосновка.

**Начальная цена с НДС – 9 118 978 бел. руб.** Площадь земельного участка **2,4318 га.** Задаток в сумме 900 000 бел. руб. перечисляется на **р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **24.08.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.08.2010** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.**

ОХОТХОЗЯЙСТВО НЕМАН

**Наступает сезон фотоохоты на Белого лося!**

Охотники и местные жители Логойского района неоднократно видели в охотоугодьях «ГТФ «Неман» лося удивительной окраски – белой!

**Охотничье хозяйство ОАО «ГТФ «Неман» проводит фотоконкурс «БЕЛЫЙ ЛОСЬ».**

Конкурс проводится с целью популяризации природы нашей страны и пропаганды здорового образа жизни.

К участию в фотоконкурсе приглашаются профессиональные фотографы и фотолюбители.

На конкурс предоставляются цветные фотографии лося-альбиноса форматом 20х30 см, сделанные в охотничьих угодьях охотохозяйства «ГТФ «Неман», расположенных в восточной и юго-восточной частях Логойского района Минской области. Каждый отпечаток должен сопровождаться электронным оригиналом с максимально возможным разрешением.

**УСЛОВИЯ УЧАСТИЯ:**

Каждый участник конкурса обязательно должен прислать вместе с фотографиями их список с названиями, указанием даты, места и условий съемки, бэдж участника конкурса (выдается егерем обхода № 2), сведения о себе (ф.и.о., адрес, № телефона).

Срок проведения конкурса – **до 31 декабря 2010 года.**

**ПОБЕДИТЕЛИ КОНКУРСА НАГРАЖДАЮТСЯ:**

**1-е место – 5 000 000 белорусских рублей;**
**2-е место – 3 000 000 белорусских рублей;**
**3-е место – 2 000 000 белорусских рублей.**

Все расходы, связанные с уплатой причитающихся налогов, несет победитель.

Организаторы конкурса оставляют за собой право использования фотографий в издании журналов, книг, брошюр, буклетов, фотоальбомов, а также размещения на «билл-бордах» с обязательным указанием фамилии автора.

Фотографии, присланные на конкурс, авторам не возвращаются.

**Работы на фотоконкурс принимаются по адресу: 230771 г. Гродно, ул. Орджоникидзе, 18 с пометкой «Фотоконкурс», или на e-mail: info@tabak.by**

Результаты конкурса будут опубликованы **6 января 2011 года** в газете «Паляўнічы і рыбалоў».

По вопросам возможного местонахождения лося-альбиноса обращаться по **тел. +375 29 787 28 02.**

**По вопросам условий конкурса обращаться по телефону +375 152 54 20 31.**

## Манеты да дзесяцігоддзя ЕўрАзЭС

**З сённяшняга дня Нацыянальны банк Беларусі ўводзіць у абарачэнне памятныя манеты «ЕўрАзЭС. 10 год», паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва Упраўленні інфармацыі галоўнага банка краіны.**

Сярэбраная манета мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925, масу 33,63 грама; медна-нікелевая манета выпушчаная наміналам 1 рубель. На пярэднім баку манетаў у цэнтры ў абрамленні беларускага арнаменту «Жыцень», што сімвалізуе высокую ўраджайнасць, дабрабыт, размешчаны знак Еўразійскай эканамічнай супольнасці, на адваротным у цэнтры, у абрамленні сцягоў дзяржаў, што ўваходзяць у склад Еўразійскай эканамічнай супольнасці, — выява зямнога шара, дзе на мацерыку Еўразія акцэнтаваныя граніцы краіні—членаў ЕўрАзЭС (на сярэбранай выява зямнога шара выкананая галаграмай). Манеты адчаканеныя на РДП «Казахстанскі манетны двор Нацыянальнага банка Рэспублікі Казахстан»: сярэбраная якасцю «пруф», медна-нікелевая — «пруф-лайк». Тыраж сярэбранай манеты складае 3000 штук, медна-нікелевай — 3500.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ВАДА — ВЫРАТАВАННЕ АД СПЯКОТЫ?

**І гібель для тых, хто ставіцца да яе занадта бяспечна. 15 жыхароў Гомельшчыны патанулі за мінулы тыдзень. Акрамя таго, у рэках вобласці знайшлі апошні прытулак прыезджыя з Расіі, Украіны, іншых абласцей Беларусі. Усе загінулыя — мужчыны ў росквіце сіл. Сярод ахвяраў вады — 9-гадовы хлопчык з Нароўлі, які адпачываў з сябрамі на беразе ракі Славечна ля вёскі Антонаў.**

Па словах спецыяліста гомельскай абласной арганізацыі выратавання на вадзе Сяргея Касцючэнкі, звычайна падзеі развіваюцца па аднолькавым сцэнарыі. Група на беразе адпачывае, ужываючы зусім не мінералку. Потым усе заходзяць у ваду ахаладзіцца, і праз некаторы час высвятляецца, што аднаго з сяброў ужо няма. Ёсць выпадкі, калі п'янага сябра кідаюць аднаго працверазіцца ля вады. У Жлобінскім раёне каля вясковых могілак у тэхнічным вадаёме глыбінёй 1,3 метра і памерам 7х9 сталі тануць маладыя мужчына з жанчынай, якія з-за ўжытага алкаголю не трымаліся на нагах, не тое што на вадзе. Жанчыну выцягнулі з вады дзеці, якія гулялі на беразе. Мужчына захлынуўся.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**




Калі карэспандэнт «Звязды» Надзея Дрыла даведалася, што на Лагойшчыне месціцца яе вёска-цёзка — ногі ў рукі і туды.

**Жыццёвая мудрасць МІКОДЗІХІ**

СТАР. 3

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.07.2010 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 990,00 | 1 чэшская крона | 152,30 |
| 1 еўра | 3 875,04 | 1 польскі злоты | 939,34 |
| 1 латвійскі лат | 5 497,33 | 1 расійскі рубель | 97,80 |
| 1 літоўскі літ | 1 123,19 | 1 украінская грыўня | 378,48 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 30,5739 |
| 10 UAH | 38,6997 |
| 1000 BYR | 10,2220 |
| EUR | 39,4373 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

**Начальнік ДЭУ-10 РУП «Мінскаўтадар-Цэнтр» Аляксандр КАНОПЛІЧ:**

# «ЗАЎСЁДЫ АДПАВЯДАЦЬ НЯПІСАНАМУ НАЙВЫШЭЙШАМУ ЎЗРОЎНЮ»



**АКРАМЯ ідэальнага тэхнічнага стану, для многіх дарог, што стаяць на балансе ДЭУ-10 РУП «Мінскаўтадар-Цэнтр», характэрныя павышаная эстэтыка і нават своеасаблівы шарм. Калі гаварыць пра аўтадарогу Мінск — Нацыянальны аэрапорт «Мінск», па якой госці Беларусі, у тым ліку і самыя высокапастаўленыя, накіроўваюцца ў сталіцу, то гэта і добраўпарадкаваныя ўзбочыны, і ідэальныя газоны на раздзяляльнай паласе, і асвятленне ў цёмны час сутак... Дарогамі, якія абслугоўваюць людзі ў ярка-аранжавай форме «Мінскаўтадар-Цэнтра», штодня карыстаецца вышэйшае кіраўніцтва краіны. І, вядома, — сотні тысяч аўтамабілістаў.**

**Даведка «Звязды»**

**На балансе ДЭУ-10 знаходзяцца аўтадарогі М9 — Мінская кальцавая аўтадарога (56,5 км), М2 — Мінск — Нацыянальны аэрапорт «Мінск» (ад гарадской рысы да самога аэрапорта (28 км), М3—Мінск — Віцебск (ад мяжы сталіцы да Лагойска); шэраг дарог рэспубліканскага значэння: Р80 Слабада — Паперня і Р40 (старая «лагойка»). Таксама на балансе ДЭУ знаходзяцца два вельмі важныя пад'езды: ад МКАД да пансіяната Савета Міністраў (размяшчаюцца высокапастаўленыя госці краіны) і да комплексу «Азёрны» — адной з рэзідэнцый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

— Для аптымізацыі абслугоўвання ўсе дарогі падзелены паміж чатырма лінейнымі дыстанцыямі — ЛДД, — расказвае начальнік ДЭУ-10 Аляксандр КАНОПЛІЧ. — Калі гаварыць пра сілы і сродкі, якімі ўся гэтая даволі адказная гаспадарка падтрымліваецца ў належным стане, то пытанне, як гэта часта бывае, упіраецца ў фінансаванне. Кожны рубель з тых, што выдаткоўваюцца, даводзіцца выкарыстоўваць з максімальнай эфектыўнасцю. Таму для выканання многіх відаў работ мы стварылі рамонтны ўчастак — спецработ. Дарожнікі сваімі сіламі рамантуюць пашкоджаную падчас ДТЗ бар'ерную агароджу, дзе трэба, працягваюць устаноўку агароджы другой групы — той, якая перашкаджае пешаходам перасякаць праезную частку ў небяспечных месцах, адно са звёнаў спецучастка займаецца абслугоўваннем асвятлення на дарозе М2. Выконваюцца тут і разнастайныя віды работ па рамонце асфальтабетоннага пакрыцця. Калі ўлічыць, што размова ідзе пра надзвычай загружаныя магістралі, у тым ліку МКАД, асаблівую важнасць набывае і хуткасць рамонту. На дзень рух не спыніш. Як паабяцаў Аляксандр Каноплім, каб не ствараць нязручнасці карыстальнікам, тэрміны такога рамонту дарожнікі і надалей будуць сціскаць да мінімуму.

## За будаўнікоў МКАД замоўце слоўца...

З моманту ўвядзення кальцавой і па сённяшні дзень ад яе карыстальнікаў даводзіцца чуць нараканні на якасць асобных участкаў аўтадарогі. Што з гэтай нагоды думаюць людзі, якія яе абслугоўваюць?

— Для горада, для карыстальнікаў МКАД — безумоўна, вялікі падарунак, — лічыць Аляксандр Адамавіч. — Калі гаварыць пра лічбы, варта адзначыць, што падчас будаўніцтва кальцавой разлічвалі на нагрузку ў 25—30 тысяч аўтамабіляў у суткі. Сёння інтэнсіўнасць руху дасягае 60 тысяч... Таксама варта адзначыць, што акупілася кальцавая ўсяго за паўтара года!

Сапраўды ёсць участкі, якімі карыстальнікі былі незадаволеныя ад пачатку, ёсць і ўчасткі, якія без нейкіх грунтоўных рамонтных мерапрыемстваў па сёння задавальняюць і спажыўцоў, і дарожнікаў. У цэлым жа любая дарога, а тым больш такая як МКАД, патрабуе да сябе павышанай увагі. Асабліва «прыжылося» адно рамонтнае мерапрыемства: фрэзіраванне старога верхняга слою пакрыцця дарогі і ўкладка новага сучаснага шчэбенева-масцікавага асфальтабетону, які дае павышаную трываласць і роўнасць. Сёлета такім чынам замянілі 16 кіламетраў пакрыцця на МКАД. Калі гаварыць пра рамонтныя мерапрыемствы на штучных збудаваннях, то гэта ў першую чаргу рамонт, аднаўленне дэфармацыйных швоў на стыках стужкі дарогі і мастоў, і пуцеправодаў. Менавіта на іх неналежны стан мы атрымліваем



Дыспетчарская вахта — кругласутачная. Гэты фотаздымак быў зроблены у час, калі за маніторамі дзяжурыў Аляксандр КУЗЬМЯНКОЎ.

найбольш справядлівых нараканняў. Тэхналогію рамонту гэтых швоў мы засвоілі літаральна летась. Пакрысе нарошчваем аб'ёмы. Патрэба ў такім відзе рамонту ёсць і на іншых нашых дарогах, напрыклад, на віцебскім накірунку.

## Адно з патрабаванняў — эстэтыка

Выканаўчая ўлада звяртае вялікую ўвагу і на парадак на сетцы нашых дарог. Акцэнты падобныя: мінулы год быў Годам навядзення парадку на зямлі. Чаму дагэтуль усё не ў належным стане? Асаблівая ўвага — эстэтыцы. У тым ліку ўзбочын дарог. Вядома, з нашага пункту гледжання затраты на акоску празмерныя. Аднак калі гаварыць пра гарадскую рысу, пра такія накірункі як Мінск — Нацыянальны аэрапорт «Мінск»... Вымушаны пагадзіцца, што госці Беларусі з першых крокаў па нашай зямлі павінны бачыць знакамітыя прыгажосць, чысціню, парадак і гасціннасць.

Сапраўдная праблема для нас — смецце на дарогах і ўзбочынах. Асабліва гэта актуальна на дарогах з вялікай інтэнсіўнасцю руху. На той жа МКАД, выхадах з Мінска. Ды і дачнікі ўносяць сваю лепту. Каб нешта змянілася ў свядомасці людзей, думаю, павінна змяніцца яшчэ не адно пакаленне. Ці, як варыянт, вялікія штрафныя санкцыі. Ёсць і альтэрнатыўныя прапановы. Напрыклад, пра тое, што нядрэнна было б да ўборкі смецця прыцягваць навучэнцаў аўташкол. Можа тады, калі яны атрымаюць пасведчанні і самастойна выедуць на дарогі, не стануць выкідваць смецце з вокнаў аўтамабіляў... Нам жа пакуль застаецца весці растлумачальную працу ды ўдасканальваць тэхналогіі па ўборцы смецця. Літаральна на днях нам дэманстравалі новую айчынную распрацоўку — пыласос па ўборцы смецця. Гэта прычэп да любога транспартнага сродку, які мае рукаў даўжынёй 12 метраў. Вельмі зручна і хутка! Усё смецце з тых жа прыпынкаў грамадскага транспарту прыбіраецца ўначы і за лічаныя хвіліны, не ствараецца перашкодаў руху грамадскага транспарту, нязручнасцяў пасажырам. Такая машына і нам дазволіць перайсці на начную работу.

## Да зімовага ўтрымання рыхтуемся летам

Практычна 7 месяцаў у год дарожнікі знаходзяцца ў рэжыме так званага зімовага ўтрымання. Немалаважнымі ў гэтым з'яўляюцца менавіта тэхналогіі. Пры разуменні і падтрымцы кіраўніцтва «Мінскаўтадар-Цэнтра» было закуплена фінскае абсталяванне на базе айчынных МАЗ-МАНаў. Атрымалася вельмі сбалансаваная машына, якая абсталявана камп'ютарам, мае франтальны і бакавы адвалы, песка-солеразмеркавальнік... І, што вельмі важна, гэтая машына дазваляе чысціць дарогі з выдатнай якасцю на хуткасці да 80 кіламетраў у гадзіну! А гэта і меншая нязручнасць для ўдзельнікаў руху, і эканомія супрацьгалалёднага матэрыялу, а значыць, і меншы шкодны ўплыў на кузаў аўтамабіляў. Сезон гэта тэхніка адпрацавала на віцебскім накірунку. Вельмі спадзяёмся, што яшчэ дзве падобныя машыны сёлета з'явяцца на МКАД.

Ёсць і яшчэ некаторыя задумкі, што, спадзяёмся, зменшаць незадаволенасць карыстальнікаў нашых дарог. Для процігалалёднай апрацоўкі плануем шырэй выкарыстаць расолы. Асноўныя эфекты, якія чакаем, — больш хуткая ліквідацыя зімовай слізкасці і змяншэнне агрэсіўнага ўздзеяння на аўтамабілі, абутак і навакольнае асяроддзе. Ёсць у планах і больш поўнае выкарыстанне інфармацыі з дарожна-вымяральных станцый. Распрацоўваецца праграмны прадукт пад назвай «Кіраванне зімовым утрыманнем аўтадарог». Гэта ўжо не проста ацэнка абстаноўкі ў рэжыме рэальнага часу — гэта даступна і сёння, прычым нават у відэарэжыме, — а і магчымасць прадбачыць развіццё сітуацыі і прыняць прэвентыўныя меры.





За ўчасткам спецработ замацавана забеспячэнне аўтадарогі электраасвятленнем.

## Дарогі камфортныя і... бяспечныя

Пачынаючы з 2005 года, мы адзначаем тэндэнцыю па змяншэнні аварыйнасці на нашых дарогах і, што вельмі важна, па рэзкім змяншэнні колькасці загінулых і параненых. Асаблівая ўвага надаецца месцам канцэнтрацыі ДТЗ. Проста «зачараванае» месца — гэта ўчастак МКАД ад Кунцаўшчыны да Ждановічаў. Вельмі шмат ДТЗ здараецца таксама ў раёне «Рыбакомплекса» і выезда з вуліцы Казінца... Там, дарэчы, вельмі часта з-за элементарнай няўважлівасці збівалі дарожны знак. Мы прааналізавалі сітуацыю і знайшлі выйсце: устанавілі знак са светадыёднай падсветкай. Праблема вырашылася.

Каб больш эфектыўна кіраваць рухам на МКАД і зрабіць яе для карыстальнікаў яшчэ больш зручнай, у хуткім часе плануецца ўстаноўка інфармацыйных табло, якія праінфармуюць аўтамабілістаў аб складзе і шчыльнасці патоку наперадзе, папярэдзяць пра ДТЗ і заторы...

Неабходна і ўзаконеная відэафіксацыя парушэнняў хуткаснага рэжыму. На МКАД вымяральныя станцыі амаль штодня фіксуюць ліхачоў, якія рухаюцца з хуткасцю ў 200 і больш кіламетраў у гадзіну. 120 кіламетраў у гадзіну — увогуле звычайная з'ява... Гэта небяспечна і недапушчальна!

**Парада спецыяліста**

**Калі гаварыць пра загружанасць МКАД, то аналіз руху па палосах паказаў, што самай загружанай з'яўляецца другая. Найменш загружаная, як не парадаксальна, першая. Раю аўтааматарам улічваць гэты факт і быць элементарна культурнымі і ветлівымі: не займайце трэцюю паласу, калі вы апераджаеце з нязначнай хуткасцю.**

**Сяргей ПРОТАС, Алена ДАЎЖАНОК, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**



Рамонт элементаў агароджы на МКАД дарожная служба праводзіць не спыняючы руху транспарту. Фотаздымак знаёміць з дарожнымі рабочымі Алегам ЯЦЭВІЧАМ і Аляксандрам БУДЗЬКО, якія працуюць на гэтым участку.



— Тут будзе ўстаноўлены помнік ветэранам дарожнай гаспадаркі, — паведаміў нам начальнік ЛДД-102 Уладзімір ЛАТУШКІН.



У гаспадарцы дарожнікаў ёсць і газонакасілкі.

# Жыццёвая мудрасць МІКОДЗІХІ

Надзея ДРЫЛА

**На долю Таццяны Міхайлаўны Залуцкай, ураджэнкі вёскі Дрыла 1, выпала нямала стратаў. Але сёння, калі за плячыма без малога дзевяць дзясяткаў гадоў, яна можа смела сказаць, што не страціла самага галоўнага...**

### «І рэчка ў нас Дрылянка»

Ля хаты Таццяны Міхайлаўны завіхалася маладая дзяўчына. Сацыяльны работнік, як высветлілася пазней, наведвае бабулю два разы на тыдзень.

— Вады прынясе, па хлеб у краму сходзіць, у хаце парадак навядзе, — усміхаецца 88-гадовая гаспадыня. — І тое, што каля хаты чысценька, таксама яе заслуга. Я ж ужо бездапаможная. Ледзьве хаджу на трох нагах (паказвае позіркам на кіёк). З газеты, кажаце? Ну добра, заходзьце. Я чытаць люблю. Выпісваю «Царкоўнае слова», «Тайна душы», «Свет з богам» ды наш лагойскі веснік *(смяецца)*. Гэта я так празвала раённую газету, бо там усё скрозь, што ў раёне адбываецца, пішуць. Дайсці далёка не магу, дык хоць прачытаю. Я і яшчэ выпісвала б што-небудзь, але пенсія ж не гумавая... Як, кажаш, цябе клічуць?..

Калі Таццяна Міхайлаўна даведалася, што маё прозвішча літарка да літаркі супадае з назвай вёскі, у якой яна нарадзілася, шчыра здзівілася.

— Ну і ну, я ж усё жыццё тут жыву, але і блізка не чула такога прозвішча. А можа нехта з вашых продкаў, калі нас з вамі на свеце не было, меў двор на гэтай зямлі? Пасля пераехаў... Адкуль вы родам?

— З Віцебскай вобласці.

— Пераехаў на Віцебшчыну, а вёску ў памяць аб ім людзі празвалі Дрылай 2-й. І рэчка ў нас, дарэчы, Дрылянкай завецца. Яна там, у той 2-й Дрыле, і пачынаецца.

Мікодзіха распавяла, што яе родную вёску, якая месціцца за некалькі крокаў ад Дрылы 2, раней людзі звалі Навікамі. Бо зямлю, якая да гэтага належала пану, выкупілі новыя людзі — прадзеды маёй суразмоўніцы Лука Саболька і Вікенцій Малевіч. Пасля ўжо, калі заняліся перапісам, вёску, так як яна знаходзілася бліжэй да цэнтра воласці, назвалі Дрылай 1.

### «Хто на каго крыўду мае, каб немцам не пікнулі»

Калі пачалася вайна, Таццяне Міхайлаўне было 19. Узгадвае пра яе не надта ахвотна, і нядзіўна, бо яе старэйшы брат Валодзя так і не вярнуўся з фронту, нават паведамленне не прыйшло....

— Памятаю, спачатку стараста вёскі хадзіў па хатах і збіраў хлеб. Палову партызанам аддаваў, палову — немцам. А пасля дык немцы ўсялякі сорам згубілі: прыходзілі і, не пытаючыся, забіралі ў каго курыцу, у каго свінчо. Усяк было. Пераасжылося.

Больш за ўсё запомніўся Таццяне Залуцкай той дзень, калі да іх у хату прыехаў свой чалавек і папрасіў яе бацьку, які быў святаром, сабраць усіх аднавяскоўцаў. «Скажы ім, Міхаіл Парфёнавіч, калі дзе з кім хто не ў ладзе альбо хто на каго крыўду якую мае, каб немцу не пікнулі. Бо яны ж не будуць разбірацца — адразу кулю ў лоб».



У маіх вёсках-цёзках ні многа ні мала, а больш за паўсотні жыхароў. Самага юнага — Мікіту Вярбіцкага — сустрэла побач з домам, дзе ён жыве з дзядулем, бацькамі і двума братамі.

### «Дык на ферме ж абразоў няма»

Нялёгка прыйшлося сям'і Таццяны Міхайлаўны і пасля вайны. Горай чым злодзею аўтарытэту не было. А ўсё з-за таго, што бацька быў святаром... Нават дзеці малыя і тыя падкладалі айцу Міхаілу пад колы веласіпеда, на якім ён ездзіў на службу ажно за 25 кіламетраў, палкі ды бярвёны.

— Кпілі не толькі з таты, але і з нас, яго дзяцей. Я, як сёння памятаю, пайшла да старшыні калгаса прасіцца, каб перавёў мяне з поля на ферму працаваць. Там грошай больш плацілі, а мне дзецям хацелася хоць што набыць. У школу ж ходзяць. Дык пачула ў адказ здзеклівае: «Дык на ферме ж абразоў няма». Бачыце, як было... Але, дзякуй Богу, пражылі.

Ніколі не сатрэцца з памяці Мікодзіхі і той дзень, калі мясцовае начальства выпісала яе бацьку за тое, што маліўся, 50 рублёў штрафу (у Дрыле 1 не было царквы, таму айцец Міхаіл ладзіў службу для людзей у сваёй хаце).

— А калі даведаліся, што мой муж яго туды на кані падвёз (тата жыў на той час ужо разам з намі ў Хатаевічах), то сказалі яму здаць каня. Жарты, — папа падвёз. А бацьку выклікалі ў райвыканкам. Як зараз бачу, апрануў падраснік, крыж надзеў і кажа «Дзеткі, прабачце, пайду на аўтобус» (ён тады на мыліцах перасоўваўся). «Тата, кажу, а дзе мы твае косці будзем шукаць? Калі ім трэба, прыедуць і завязуць». І не пусціла яго. У той жа дзень пайшла ў банк і заплаціла тыя 50 рублёў, гэта ж на той час была ўся мая месячная зарплата.

### «Чым гарэлку піць, лепш хай у царкву ходзяць»

Таццяна Міхайлаўна паспела пахаваць не толькі мужа, але і 39-гадовага сына. Падчас аварыі, у якой яна страціла і 40-гадовую дачку, зламала дзве нагі, 6 рабрын. Практычна тры гады правалялася ў бальніцы.

Здаецца, можна было апусціць рукі і страціць сэнс жыцця, а Таццяна Міхайлаўна вырашыла ажыццявіць сваю даўнюю задуму — аднавіць у Акцябры — цэнтры сельсавета — царкву, якая згарэла падчас вайны. Якраз падабраўся момант: пабудавалі новую школу. Стары драўляны будынак пуставаў.

— Я пайшла да ранейшага старшыні сельсавета і папрасіла аддаць старую школу пад царкву. «Ды навошта яна нам? Ёсць жа касцёл». «А калі подпісы збяру?» — не адступала я. І што вы думаеце, атрымаўшы згоду, на мыліцах па снезе за 2 дні сабрала 200 подпісаў. Гэта было ў 93-м годзе.

І года не прайшло, як пабудавалі царкву. Але чаго гэта каштавала Мікодзісе...



Жонка Нікадзіма не па чутках ведае, што жыццё пражыць — не мех пашыць. Але як бы цяжка ні было, самае галоўнае жыць у ладзе са сваім сумленнем.

**П'янае жыццё да дабра не давядзе, паверце вы мне, не адзін год на свеце жыву. На мой розум, чым гарэлку піць, лепш хай людзі ў царкву ходзяць.**

— Колькі парогаў паабівала, каб толькі мне пайшлі насустрач, і не пераказаць. Перавезці стары будынак на старое царкавішча дык неяк перавезлі. А вось траншэю капаць, каб табе хоць адзін чалавечак дапамог. Узяла рыдлёўку ў рукі, і за пару дзён з Божай дапамогай выкапала. Фундамент закласці хлопцаў з ПТВ папрасіла. Ваду ж на заліўку фундаменту ў флязе вось на гэтай калясачцы (паказвае) цягала... Але што языком малоць, усё ж гэта ў мінулым. Царква стаіць. І тое добра.

Таццяна Міхайлаўна ўзгадала, як у вайну разам з аднавяскоўцамі абыходзілі вёскі з хрэсным ходам, маліліся.

— І што вы думаеце, Бог мілаваў. Немцы, хоць і стаялі паблізу ў Плешчаніцах, ніводнага жыхара Дрылы не схапілі. Загінулі толькі тыя ўраджэнцы нашай вёскі, якія на фронце былі. Бачыце, якія цуды вера робіць. У нас тут і цяпер шмат вернікаў. Але і аматараў выпіць хапае. П'янае жыццё да дабра не давядзе, паверце вы мне, не адзін год на свеце жыву. На мой розум, чым гарэлку піць, лепш хай людзі ў царкву ходзяць.

### «Хай на працы Рыгорам Аляксеевічам завуць, а прыедзе да мяне — дык Грыша і ўсё»

Ад мясцовых жыхароў даведалася, што Генеральны пракурор нашай краіны Рыгор Васілевіч таксама родам з Дрылы 1.

— У гэтай хаце гадаваўся, — абводзіць поглядам свой дом Таццяна Міхайлаўна. — Да другога класа. А пасля з маці ў Мінск пераехаў, каб англійскую мову вучыць. Прыемна, што пляменнік выбіўся ў людзі. Грыша заўсёды добра вучыўся, быў не па гадах дарослым, працы ніколі не цураўся. Раней, калі вас яшчэ на свеце не было, надта цяжка было кароўку пракарміць. Дык мой муж папрасіў у лясніцтве невялічкую лату сенакосу. За гэта павінен быў прарэджваць лес. Грыша, яму тады было гадоў 8, сам выклікаўся дзядзьку дапамагаць зарабляць на сена для кароўкі. Возьме з сабой вады, кавалак хлеба ды скварку і ад ранку і аж да вечара ў лясочку працаваў. Даўней усе прывучалі дзяцей з маленства да працы... Я, калі мне было 6 гадоў, таксама хадзіла з маці на поле жаць. А вы цяпер 20-гадовага папрасіце, каб у полі адбыў, і заплаціце колькі тысяч, нізашто ніхто не пойдзе. Гэткае выхаванне цяпер, без паняццяў. Таму і жыць цяжка цяпер...

* * *

На развітанне Таццяна Міхайлаўна прыгарнула мяне да сябе са словамі: «Мой жа муж Нікадзім з вайны вярнуўся без нагі, з кантузіяй. Цяжка было, але не кінула. Але не падумай, ні аб чым не шкадую, бо жыла ў ладзе са сваімі сумленнем, — і задуменна працягнула: — Гэта ж, мая даражэнькая, самае галоўнае, каб пасля столькіх гадоў сабе ў вочы не было сорамна глядзець...»

**Лагойскі раён. Фота аўтара.**


**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ХОУМ КРЕДИТ БАНК»**

HOME CREDIT BANK

г. Минск, ул. Одоевского, 129, 220018, Республика Беларусь
Тел.: (8017) 229 89 91, www.homecredit.by

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2010 г.**

ОАО «ХКБанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2010 | 01.07.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 394,1 | 240,3 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 1 463,1 | 369,5 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | - | - |
| | для торговли | 11031 | - | - |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | - | - |
| | в наличии для продажи | 11033 | - | - |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 20 053,3 | 18 432,0 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 142 753,3 | 95 406,8 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | - | - |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 5 921,4 | 5 963,7 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 19 233,2 | 26 044,3 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 189 818,4 | 146 456,6 |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | - | - |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 7 568,3 | 27 671,0 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 74 679,3 | 56 726,4 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | - | - |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 7 842,1 | 8 942,9 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 90 089,7 | 93 340,3 |
| 18 | КАПИТАЛ | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 62 287,0 | 45 997,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 3 114,3 | 973,0 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 34 064,4 | 6 065,5 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 263,0 | 80,8 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 99 728,7 | 53 116,3 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 189 818,4 | 146 456,6 |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 135 884,3 | 147 087,5 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 90 078,3 | 66 248,2 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2010 г.**

ОАО «ХКБанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2010 | 01.07.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 11 020,4 | 8 293,6 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 3 139,7 | 3 558,7 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 7 880,7 | 4 734,9 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 34 092,1 | 19 319,8 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 608,0 | 1 038,5 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 32 484,1 | 18 281,3 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 7 391,7 | (-16 002,0) |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | - | - |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 1 927,1 | 1 028,9 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 2 488,0 | 14 545,7 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 13 783,2 | 10 319,0 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 13 408,5 | 3 061,1 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 4 387,4 | 1 471,5 |
| **15** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | **16 738,3** | **5 679,4** |

**Председатель Правления** **Табатадзе А.Н.**

**Главный бухгалтер** **Глазырина О.В.**

**Дата подписания 09.07.2010 г.**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 18 от 29.11.2007 г.
Свидетельство о государственной регистрации № 807000056 от 10.07.2002 г. УНП 807000056.


# ХРЭСНЫ ХОД АД БАБРУЙСКА ДА БАРКАЛАБАВА

**18 ліпеня з Бабруйска выйшлі хрэсным ходам праваслаўныя вернікі, якія за тыдзень пройдуць шлях да горада Быхава. Там у наступную суботу паломнікі будуць браць удзел у свяце знакамітага абраза Баркалабаўскай Божай Маці.**

Хрэсны ход арганізавала моладзь Бабруйскай праваслаўнай епархіі. У ім удзельнічае ад 50 да 100 чалавек. Вернікі пройдуць больш за сотню кіламетраў. Іх сустракаюць па дарозе ў паселішчах, дзе ёсць праваслаўныя храмы, і наладжваюць з нагоды юбілею Перамогі малебны ў памяць воінаў, якія аддалі свае жыцці за Радзіму. Хрэсны ход ужо гасцяваў у Кіраўску, Мышкавічах, Паўлавічах і Жылічах.

— Так, мы ідзём і нам спякотна, але мы, праваслаўныя хрысціяне, робім крок насустрач Богу, і ён умацоўвае нас духоўна і фізічна, — расказаў па тэлефоне святар Сяргей Грынюк. — Мы нават адмовіліся ад пастаяннага суправаджэння брыгады «хуткай дапамогі», таму што ўсе ўдзельнікі хрэснага ходу адчуваюць сябе цалкам нармальна. Няхай медыкі едуць на дапамогу тым, хто мае патрэбу. А з намі Бог!

Вернікі нясуць харугвы, крыж-машчавік і Баркалабаўскі абраз Божай Маці. 24 ліпеня паломнікі спадзяюцца стаць удзельнікамі гістарычнай падзеі: вяртання ў адноўлены Баркалабаўскі жаночы манастыр старажытнага абраза, які шануецца як цудатворны.

**Ілона ІВАНОВА.**

# Будзе Віцебскі аўтамабільны

**У Віцебску ўжо ўвосень распачне працаваць завод, дзе на базе шасі аўто вядомых вытворцаў «Форд», «Пежо», «Івека» будуць вырабляць мікрааўтобусы, машыны «хуткай дапамогі», прамтаварныя і прадуктовыя фургоны, эвакуатары і нават аўто для рытуальных паслуг. Памер інвестыцый — каля 15 мільёнаў долараў. Ініцыятар інвестыцыйнага праекта — фірма з Ніжняга Ноўгарада, якая стала заснавальнікам сумеснага таварыства «Грандыскар». На ўскраіне Віцебска на тэрыторыі свабоднай эканамічнай зоны з часам адкрыецца сучасная вытворчасць аўто. Для стварэння вытворчасці будуць выкарыстоўвацца металічныя сховішчы, рэзервуары, якія даўно не эксплуатуюцца. Агульная плошча зямельнага ўчастка складзе болей за 1,2 гектара.**

— Праектна-каштарысная дакументацыя ўжо гатовая. Хутка распачнецца будаўніцтва першага цэха. Усе машыны, якія вырабляем у Ніжнім Ноўгарадзе, хочам вырабляць у Беларусі, — дзеліцца планамі кіраўнік прадпрыемства Юрый Любімаў. — Наша прадпрыемства з Ніжняга Ноўгарада за некалькі гадоў сваёй дзейнасці засвоіла шмат мадыфікацый — каля 70 відаў спецыяльных аўто: для медыкаў, перавозкі інвалідаў, для патрэб выратавальнікаў, сілавых структур. Пакуль што ўсе камплектуючыя будуць пастаўляцца з Ніжняга Ноўгарада. У Віцебску будзе на першым этапе ажыццяўляцца толькі зборка на базе аўто. А потым плануем размясціць заказы на прадпрыемствах Віцебскай вобласці. І максімальна пастараемся адысці ад паставак камплектуючых з Расіі.

Інвестыцыйны праект арганізацыі і будаўніцтва сучаснага аўтамабільнага завода разлічаны на тры гады. Плануецца стварыць каля пяцідзесяці рабочых месцаў. Толькі 30 % спецмашын будуць рэалізоўвацца ў Беларусі. Астатнія экспартавацца. Запланавана выйсці на выраб 6 тысяч аўто ў год. І кошт такіх машын прывабны: у 1,5-2 разы меншы, чым у канкурэнтаў.

Наступным этапам развіцця аўтамабільнага будаўніцтва ў Прыдзвінскім краі, на думку старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра Косінца, можа стаць будаўніцтва аўтамабільнага завода ў Оршы. Вопыт вырабу тэхнікі на колах у рэгіёне ўжо ёсць. Толькі ў аграрным сектары стварылі менш чым за два гады каля 30 найменняў аграрнай тэхнікі.

Дарэчы, на віцебскім аўтапрадпрыемстве ўжо падумваюць вырабляць спецыяльныя аўто пад маркай «Віцебскі аўтазавод».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Тэхніка не вытрымлівае спякоты

**Райцэнтр Акцябрскі з насельніцтвам у 7,5 тысячы чалавек ноччу застаўся без электраэнергіі. З-за спякоты адбылося адключэнне двух трансфарматараў. Без электрычнасці заставаліся ў тым ліку раённая бальніца, хлебазавод, раённы вузел сувязі, водазабор. Паўсюль у момант аварыі аўтаматычна былі ўключаныя дызельэлектрастанцыі. Аварыйныя брыгады з Акцябрскага і Светлагорскага раёнаў аднавілі энергазабеспячэнне праз дзве гадзіны. Прычынай выхаду са строю абсталявання ў прэс-службе Гомельскага ўпраўлення МНС называюць нагрэў масла ў трансфарматары. Далей адбылося выцісканне ізалятара трансфарматара і выцяканне масла.**

У Гомелі на трансфарматарнай падстанцыі ПС-110 «Заходняя» ноччу адбылося пашкоджанне высокачастотнага кандэнсатара сувязі, разбурэнне апорнай ізаляцыі і яе адключэнне — грамадзяне, якія пачулі выбух, тэлефанавалі ў МНС. У выніку без электраэнергіі заставаліся Гомельская гарадская клінічная бальніца № 1, каналізацыйна-помпавая станцыя, 170 шматкватэрных дамоў і каля 1200 дамоў прыватнага сектара ў мікраараёне Гомсельмаш Чыгуначнага раёна Гомеля. Адначасова з бальніцы патэлефанавалі ў МНС з просьбай аб падключэнні генератара і падачы электраэнергіі — у рэанімацыйным аддзяленні знаходзяцца двое дзяцей, падключаныя да апаратаў штучнага дыхання. Выратавальнікі хутка выканалі просьбу. Усе спажыўцы электраэнергіі засілкаваныя па рэзервовых лініях. Са слоў супрацоўнікаў РУП «Гомельэнерга», прычынай адключэння магла стаць паломка кандэнсатара з-за перагрэву.

Не вытрымала спякоты і абсталяванне прыватнага прадпрыемства «Гомельская ўніверсальная база». Тут адбыўся выхад аміяку з устаноўкі, якая забяспечвае холадагентам 13 халадзільных камер у тым жа будынку. На шчасце, колькасць газу, які выйшаў з устаноўкі, не перавысіла 1 кг і ніхто з людзей не пацярпеў. Выратавальнікі мяркуюць, што прычынай уцечкі стала няшчыльнасць у месцы фланцавага злучэння. І зноў жа — у выніку анамальнага павышэння тэмпературы паветра.

У сувязі з пажаранебяспечным надвор'ем на тэрыторыі Гомельшчыны ўведзены рэжым павышанай гатоўнасці, паведамляе прэс-служба Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Прамая лінія

# «СЦЕНЫ МЕРЗНУЦЬ, СТОЛЬ ЛЯЦІЦЬ... А ЖЭУ НАША «СПІЦЬ»?

**«Прамая лінія» са спецыялістамі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі выдалася спякотнай. І не з-за +30 за акном. Праблем у чытачоў «Звязды» са службамі ЖКГ аказалася шмат. Балконы, што падаюць, адсутнасць капітальнага рамонту, працяканне дахаў і г. д. На ўсе пытанні і скаргі адказвалі начальнік упраўлення эканомікі Алена ДУДЗІНСКАЯ і начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Эдмунд ГРЫШКЕВІЧ.**



***☎— Мы жывём у Карэлічах. Пяціпавярховы дом. У нас працякае балкон, аж усе сцены чорныя. Мы яго зашклілі, заслалі лінолеумам. Нам зрабілі дах, а ён усё роўна працякае. Мы звярнуліся ў ЖЭУ, каб адрамантавалі, а нам сказалі, што паслуга платная. А я ведаю, што ў нас у Карэлічах многім яе бясплатна рабілі.***

— Не павінна там цячы, калі ўсё нармальна зроблена. Трэба разбірацца. Павінны прыйсці спецыялісты і праверыць. Калі гэта было прадугледжана праектам, значыць, самі службы і будуць рабіць. А калі гэта вы самі зрабілі і хочаце зрабіць, каб лепш было, то тады вам прапануюць гэтую паслугу платна па рахунках бытавых паслуг.

І яшчэ. Нельга лінолеумам закрываць балкон. Вы накрылі, а ўнутраныя канструкцыі пакрываюцца іржой. І могуць абваліцца. Былі выпадкі, што балконы падалі і забівалі людзей.

***— І яшчэ хацела б даведацца, што ўваходзіць у тэхнічнае абслугоўванне?***

— Уваходзіць усё, што датычыцца ўтрымання дома. Гэта прыбіранне месцаў агульнага карыстання, тэрыторыі, пад'ездаў. Тэхнічнае абслугоўванне ўсяго інжынернага абсталявання. Гэта сантэхнічнае і электрычнае абсталяванне, а таксама аварыйнае абслугоўванне і інш. Па адной прыборцы па горадзе Мінску я налічыў 26 відаў работ. Асноўныя — санітарнае ўтрыманне домаўладання, г. зн. дворнік павінен падмесці асфальт і тэрыторыю каля дома. Сюды таксама адносіцца скошванне травы, выдаленне смецця са смеццепрымальнай камеры, прыборка снегу зімой, пасыпанне тэрыторыі супрацьгалалёднымі сродкамі. Не забудзем пра вільготнае падмятанне лесвічнай пляцоўкі — 1 раз на дзень, мыццё і дэзінфекцыя лесвічнай пляцоўкі — адзін раз на тыдзень, мыццё вокнаў — два разы ў год.

У тэхнічнае абслугоўванне ўключаны тэхнічны агляд і абслугоўванне тэхнічных элементаў будынка. Той жа дах нехта павінен абследаваць і сачыць, каб ён быў у нармальным стане.

Вы плаціце і за тэхнічны агляд дзвярных і аконных запаўненняў, унутранай і знешняй тынкоўкі, дзіцячай пляцоўкі. Нехта павінен паглядзець, вісяць гэтыя арэлі ці не, у якім яны стане. Тое самае і з завозам пяску, афарбоўкай і г.д.

Гэта таксама і агляд інжынерных сістэм — цэнтральнай сістэмы водазабеспячэння, ацяпляльных прыбораў, запорна-рэгулюючай арматуры, сістэмы водаадвядзення, цеплаізаляцыі, а таксама водагравальнікаў, гідраўлічных сістэм, стан электраправодкі гарышчаў ды падвалаў. А таксама паказанні кантрольна-вымяральных прыбораў.

Возьмем плату за тэхнічнае абслугоўванне. Напрыклад,120 кватэр, калі ў сярэднім узяць па 50 м кв., то будзе 6000 м кв. Памнажаем гэтую лічбу на 296, атрымліваем каля 1,7 млн руб. у месяц. Прыбіральшчыцы патрэбна мінімум 400 тыс., пасля туды трэба дадаць 140 тысяч на сацстрах. Халат трэба раз у год купіць, вядро, мяцёлку, ваду трэба аплаціць. І атрымаецца каля 600-700 тыс. Засталося 1,2 млн. Пасля пайшлі выдаткі на электрыка, сантэхніка і г.д. І атрымліваецца, што нічога лішняга не траціцца.

***— А можна адмовіцца ад тэхнічнага абслугоўвання?***

— Не. Нельга. Вось калі вы станеце таварыствам уласнікаў, аб'явіце конкурс у Карэлічах, а можа, і з Мінска прыедзе фірма і будзе вас абслугоўваць.

***☎— Наталля Міхайлаўна. Жлобін. У нас пяцікватэрны барак стары з пячным ацяпленнем. Капітальны рамонт зрабілі, але ж за печкі па сорак гадоў ніхто не браўся. ЖЭУ кажа, што няма печнікоў. А ў нас за зіму два разы дзверцы вывальваліся. Замазвалі, куплялі гэтыя сумесі. І ўсё роўна вывальваецца.***

— Дом каму належыць?

***— Раней належаў чыгунцы, а ў пазамінулым годзе перадалі гарадскому домакіраванню. Чыгуначнікі спрабавалі адрамантаваць печку і выклалі яе абліцовачнай цэглай. Сталі паліць, а там усё трэскацца пайшло.***

— А плаціце пастаянна за кватэру?

***— За тэхабслугоўванне і за капрамонт, вядома, плацім. Яны ж аднолькавыя, гэтыя сумы.***

— Ну чаму ж аднолькавыя. Для вас павінна быць зніжка. У вас жа няма цэнтральнага ацяплення, няма гарачай вады і цэнтральнай каналізацыі.



***— І дымаходы дрэнныя. У 2006 годзе ў нас увогуле абрушыўся комін. Усе баяліся нават жыць. Прычым катэгарычна не хацелі ставіць новы, бо, маўляў, маразы. І жыві як хочаш.***

— Правільныя прэтэнзіі, але, прабачце, не мы дабілі вашы дамы. Я не да таго, што меры не будуць прымацца, я наконт нашай чыгункі. З печамі паставім вас на кантроль. Праверым, наколькі ў планы гэта ўключана. Тое, што няма печнікоў, гэта не вашы праблемы. Калі вы плаціце, то ЖКГ нясе адказнасць, нават да крымінальнай, за такое ўтрыманне. Не дай Бог, нешта здарыцца. Вы толькі афіцыйна з лістом звярніцеся і след пакіньце. Таму што вось мы тут паразмаўлялі, а пытанні вырашаюцца на месцах.

***☎— Мінск, Ясеніна, 123, Рыгор Піліпавіч. У ЖРЭА мы пісалі 2 гады скаргі пра тое, што ў нас пастаянна прамярзае паўночная сцяна. Пісалі калектыўныя лісты ад усіх сем'яў, што жывуць на гэтым баку. Нам пастаянна пісалі адпіскі. І адміністрацыя Маскоўскага раёна, і ЖРЭУ Маскоўскага раёна так адказвала. Нам цяпер кажуць, чакайце маразоў, тады мы створым камісію і будзем глядзець.***

— Рыгор Піліпавіч, вы хацелі б правесці цеплавую мадэрнізацыю?

***— Ну так, зразумела.***

— Нікога не хачу вінаваціць, але будаўнікі ўвекавечылі свой брак. Тады ўжо існавалі пэўныя нормы па тэрмасупраціўленні. Таму патрэбны агляд спецыялістаў. Я магу вам агульныя падыходы сказаць. У цэлым у Мінску ў вельмі многіх дамах зроблена цеплавая мадэрнізацыя. Вы ж бачыце, што некаторыя хрушчоўкі патрабуюць мадэрнізацыі. І робім там. На гэта ўсё патрэбны фінансы...

***— А куды мае фінансы дзяваюцца? Асабіста я 30 тысяч у месяц плачу за капрамонт і столькі ж за тэхнічнае абслугоўванне.***

— Так, для пенсіянера — гэта вельмі вялікая сума. Але і гэтых грошай, на жаль, не хапае.

***— Мы прасілі, уцяпліце нам толькі адну сцяну. Два гады ідуць адпіскі. Яны ідэнтычныя, гэтыя адказы. У мяне нават копіі захаваліся. Вось 105-ты дом зрабілі, як лялечку. А нам адну сценку не могуць зрабіць.***

— Не дапаможа, Рыгор Піліпавіч, гэтая паўмера. Яе не прадзімае. Яна проста прамярзае. Адна сцяна — гэта нерацыянальнае выкарыстанне грошай. Тут патрэбны комплексны падыход. Без астатніх мерапрыемстваў, звязаных з мадэрнізацыяй цеплавога вузла, ацяплення, пераразлікам нагрузак, заменай вокнаў і г.д. эфекту не будзе. Ну, будуць шпалеры трымацца, але ўсё роўна там у кажуху сядзець будзеце. Яшчэ раз даручым разабрацца, чаму суседнія дамы робяць, а ваш не. Я ведаю, што ў Маскоўскім раёне шмат такіх дамоў робяць.

***☎— Драгічын, вул. Заводская, 12. Васіль Васільевіч. Каб адкачаць фекаліі з прыбіральні, якой павінна быць адлегласць шланга ад бочкі? Да мяне прыехалі, а там адлегласць 5-6 метраў, і не змаглі забраць. Наша ЖКГ адказала, што максімальная адлегласць — чатыры метры. Вадзіцель сказаў, што яму шланг падаўжаць не даюць.***

— Зусім ніяк немагчыма пад'ехаць?

***— Бочка пад'ехала на адлегласць каля шасці метраў ад прыбіральні. Далей клубніцы, хлеў і г.д.***

— А раней як было?

***— Раней уручную. Проста кіроўца мне сказаў, што шлангі на складзе ёсць, але яму іх не выдаюць. У ЖКГ я звяртаўся, мне адказалі, што больш за чатыры метры не бяруць.***

— Не ведаю, дзе яны знайшлі такія нормы, такога быць не можа. Разбяромся.

***— У мяне яшчэ пытанне. Дом, дзе я жыву, перадалі на баланс ЖКГ. Нам на нейкі няпоўны год далі прыбіральшчыцу. Яна пад'езды прыбірала і г. д. Першы раз за ўвесь час, а дому 30 год. Пасля яе скарацілі нейкім чынам.***

— А што, дрэнна працавала?

***— Не. Сказалі, што няма грошай утрымліваць. Па ініцыятыве ЖКГ ці каго, я не ведаю. Далі нам нейкую льготу на тэхнічнае абслугоўванне і капрамонт. Ніхто нам не патлумачыў, што гэта такое, а ў жыроўцы з'явілася. У пад'ездзе жывуць людзі састарэлыя і пенсіянеры. І парадку няма. Адзін прыбірае, а другі не. На якіх падставах нам яе скарацілі? Законна гэта ці не?***

— Законна, калі прыборку робяць. А тут паказалі цукерку і прынялі. Будзем даручаць і вырашаць гэтае пытанне.

***— Я вось чытаю газеты. Там пастаянна пішацца пра тое, што павінна быць нейкая інфармацыя, галоснасць. Людзям павінны патлумачыць, магчыма, і ў нас нейкія ёсць прапановы.***

— Згодны з вамі. Яшчэ раз напішам у выканкам і будзем з гэтым неяк разбірацца. Вы разумееце, калі нармальны падыход, то такога быць не павінна. Гэта ж няцяжка — абысці 18 кватэр і патлумачыць.

*(Працяг будзе.)*

**Настасся ЗАНЬКО.**

# СТАЛІЧНЫ БАНК ВАКАНСІЙ АДЧУВАЛЬНА «ПАЦЯЖЭЎ»

**З пачатку года колькасць вакансій у банку звестак службы занятасці сталіцы павялічылася ў паўтара раза. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміла намеснік начальніка аддзела арганізацыйна-кадравай работы камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Іна Сямёнава.**

З пачатку года па дапамогу ў службу занятасці Мінска звярнулася 12,7 тыс. чалавек. Разам з тым сітуацыя на сталічным рынку працы захавалася стабільнай. У пачатку ліпеня ў буйнейшым горадзе краіны налічвалася 4162 беспрацоўныя, а ўзровень беспрацоўя заставаўся найбольш нізкім у краіне — 0,4 працэнта ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Пры гэтым у сталіцы па-ранейшаму адзначаецца значны попыт на працоўную сілу — усяго наймальнікі Мінска паведамілі аб наяўнасці 18,8 тыс. вакансій. Праўда, пры гэтым каля 78 працэнтаў вакансій разлічаныя на прадстаўнікоў рабочых прафесій.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Сярэдняя зарплата ў прамысловасці ў маі была на 12,1 працэнта вышэйшая, чым у сярэднім па Беларусі

**На прамысловых прадпрыемствах Беларусі сярэдняя заработная плата ў маі гэтага года склала Br1 млн 298,7 тыс. Як паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце, гэта на 12,1 працэнта вышэй за сярэднерэспубліканскі ўзровень аплаты працы.**

Найбольш высокі ўзровень аплаты працы склаўся ў маі на прадпрыемствах нафтаперапрацоўчай прамысловасці — Br2 млн 389 тыс., хімічнай прамысловасці — Br2 млн 20,3 тыс., чорнай металургіі — Br1 млн 805,8 тыс. Гэта ў 1,8-1,4 раза вышэй, чым у сярэднім па прамысловасці. Сярэдняя заработная плата на прадпрыемствах швейнай прамысловасці была ў памеры Br751,6 тыс., лесанарыхтоўчай — Br776,1 тыс., тэкстыльнай — Br800,7 тыс., гарбарнай, футравай, абутковай — Br967,6 тыс., дрэваапрацоўчай — Br981,7 тыс. (на 42-24 працэнты ніжэй, чым у сярэднім па прамысловасці).

# САКРЭТ ШЧАСЛІВАГА ШЛЮБУ



**САКРЭТ шчаслівага шлюбу паспрабавала раскрыць журналістка і пісьменніца Анэлі Руфус. Яна падлічыла, якія фактары і з якой верагоднасцю могуць абумовіць развод, паведамляе NEWSru Israel.**

Кажучы пра атрыманыя вынікі, Руфус адзначае, што пералічаныя ніжэй факты дапамагаюць па-іншаму зірнуць на адносіны паміж мужчынамі і жанчынамі. Сваё даследаванне яна апублікавала ў выданні The Daily Beasts. Чыннікі разводу могуць быць самымі рознымі — ад полу дзяцей да расы партнёраў, узроўню тэстастэрону і стану здароўя. Верагоднасць распаду шлюбу можна падлічыць і па ўскосных прыкметах — напрыклад, ці ўсміхаўся чалавек у дзяцінстве пры фатаграфаванні. Калі так, верагоднасць разводу ніжэй, калі не — вышэй.

Поўны спіс 15 фактараў, якія ўплываюць на развод, прыводзіць брытанская газета The Daily Telegraph:

1. Жанчыны, якія выйшлі замуж да дасягнення 18 гадоў, могуць з верагоднасцю ў 48 % развесціся на працягу першых 10 гадоў шлюбу.
2. У выпадку, калі жанчына хоча дзіця больш, чым мужчына, іх шлюб руйнуецца ўдвая часцей, чым шлюбы пар, якія прыйшлі да згоды ў пытанні нараджэння дзяцей.
3. Верагоднасць разводу ў сям'і з двума сынамі складае 36,9 %, аднак калі сям'я выхоўвае дзвюх дачок, рызыка разводу павялічваецца і складае 43,1 %.
4. Мужчына з высокім узроўнем тэстастэрону мае на 43 % больш шанцаў развесціся, чым мужчына з нізкім узроўнем утрымання гармона ў крыві.
5. Бацькі гіперактыўных дзяцей разводзяцца нашмат часцей, чым бацькі спакойных дзяцей.
6. Пары, у якіх муж ці жонка раней знаходзіліся ў сужыцці з кім-небудзь яшчэ, прыкладна ў два разы часцей разводзяцца, чым тыя пары, удзельнікі якіх да шлюбу ні з кім не жылі сумесна.
7. Рэдка атрымліваецца стварыць моцную сям'ю людзям, якія не ўсміхаліся на сваіх дзіцячых фатаграфіях.
8. Калі плод загінуў пасля 20-га тыдня цяжарнасці, калі дзіця нарадзілася мёртвым ці сканала неўзабаве пасля нараджэння, верагоднасць разводу на 40 % вышэй, чым калі дзіця выжыла.
9. Калі жанчына хворая на рак ці склероз, яе шлюб распадзецца з верагоднасцю, якая ў 6 разоў перавышае верагоднасць разводу пры атрыманні такога дыягназу мужам.
10. Белая жанчына, якая рассталася з мужам, але пакуль не афарміла з ім разводу, з верагоднасцю ў 98 % развядзецца з ім канчаткова на працягу першых шасці гадоў пасля спынення сумеснага жыцця. Для жанчыны іспанскага (лацінаамерыканскага) паходжання такая верагоднасць складае 80 %, а для негрыцянкі — 72 %.
11. Танцоры і харэографы разводзяцца з верагоднасцю ў 43,05 %, а ў матэматыкаў ступень гэтай небяспекі складае ўсяго 19,15 %. У дрэсіроўшчыкаў — 22,5 %.
12. Фермерам развод пагражае з верагоднасцю толькі ў 7,63 %, інжынерам-ядзершчыкам — у 7,29 %.
13. У выпадку, калі адзін з сужэнцаў перанёс пашкоджанне мозгу, верагоднасць разводу — 17 %.
14. У негрыцянак першы шлюб распадаецца на працягу 10 гадоў з верагоднасцю ў 47 %, у жанчын іспанскага (лацінаамерыканскага) паходжання — у 34 %, у белых — 32 %, у жанчын азіяцкага паходжання — 20 %.
15. У жанчыны, якая праходзіць сапраўдную вайсковую службу, верагоднасць разводу на 250 % вышэй, чым у мужчыны-вайскоўца.

# Экспартны патэнцыял Беларусі: ЯК ЯГО РЭАЛІЗАВАЦЬ?

**ШМАТ у нашай краіне кажуць пра экспарт. Яго трэба развіваць, пашыраць, дыверсіфікаваць і гэтак далей. Але як гэта зрабіць найбольш эфектыўна, як выкарыстаць рэзервы і патэнцыял, як прасунуць прадукцыю з лэйблам «Зроблена ў Беларусі» на сусветныя рынкі? Напярэдадні арганізаванай цэнтрам стратэгічнага развіцця «Маркетынгавыя сістэмы» канферэнцыі па праблемах беларускага экспарту адбыўся брыфінг на тэму «Развіццё экспарту Беларусі», дзе як тэарэтыкі, так і практыкі ў экспартнай дзейнасці разважалі над пытаннямі, што хвалююць прадпрыемствы і дзяржаву.**

— Вельмі часта кажуць, што «Беларусь мае вялізны экспартны патэнцыял». Але адкуль мы гэта ведаем? Ад таго, што мы так лічым, мы нічога не маем. Вялікі экспартны патэнцыял трэба даказаць на рынках, праз канкурэнтаздольнасць, — выказаў думку **Свен-Олаф НЭВІЯК, эканамічны дарадца Бізнэс-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя Куняўскага.** — Не зразумейце мяне няправільна, я не хачу сказаць, што ў Беларусі няма канкурэнтаздольнай прадукцыі, тут справа не ў гэтым. Давайце паглядзім, куды зараз экспартуецца беларуская прадукцыя: добра, Расія, гэта настальгія па мінулым. А колькі экспарту ў Германію, іншыя краіны Еўрасаюза, ЗША — у тыя краіны, дзе сапраўды можна параўноўваць канкурэнтаздольнасць? Я мяркую, каб убачыць патэнцыял, трэба параўноўваць з лепшымі — як у футболе: раўняцца трэба на лепшыя каманды.

## Беларусь і ТНК

**Галіна ШМАРЛОЎСКАЯ, доктар эканамічных навук, прафесар, дэкан факультэта міжнародных эканамічных адносінаў БДЭУ** лічыць, што нашым прадпрыемствам трэба паціху асвойваць не толькі традыцыйныя шляхі экспарту, але і іншыя:

— Сярод асноўных іншых тэхналогій я хачу назваць, па-першае, шлях стварэння нацыянальных сеткавых структур праз экспарт капіталу, гэта значыць, пераходзіць ад экспарту гатовай прадукцыі да вытворчай дзейнасці ў іншых краінах і такім чынам пранікаць на іх рынкі. Другая тэхналогія — гэта калі прадпрыемства пачынае спецыялізавацца на вытворчасці камплектуючых, а непасрэдная зборка ажыццяўляецца ў іншай краіне. Гэта дазваляе пазбегнуць пошлінаў, а з-за пераносу вытворчых функцый з краіны базіравання вызваляюцца рэсурсы для развіцця найбольш тэхналагічных частак.

На думку Галіны Шмарлоўскай, такая фрагментацыя вытворчасці дасць магчымасць уваходжання ў тэхналагічныя ланцужкі транснацыянальных карпарацый. Разам з тым да ўдзелу ў ТНК беларускія прадпрыемствы ставяцца з пэўнай асцярогай.

— Я лічу, што роля ТНК вялікая, бо ва ўсіх напрамках Беларусь не можа сабе дазволіць падтрымліваць годны ўзровень тэхналогій, — перакананы **Аляксей ШКАДАРЭВІЧ, дырэктар навукова-вытворчага прадпрыемства «ЛЭМТ»**. — Напрыклад, у мікраэлектроніцы кожныя тры гады — новая тапалогія, і тут мы адстаём на ступень. Краіна не зможа падтрымліваць такі ўзровень, таму нам трэба працаваць у рамках ТНК. Беларусі ёсць што прапанаваць — гэта, вядома, не тэхналогіі і напрацоўкі, а высокакваліфікаваны персанал, інфраструктура і геаграфія. Таму супрацоўніцтва ў рамках ТНК — гэта захаванне тых напрамкаў, што засталіся з савецкіх часоў. Але трэба і разумець, што ТНК — гэта фактычна заглушэнне ўласнай ініцыятывы, інжынернага пачатку, гэта праца другім нумарам. Таму гэты напрамак не можа быць краевугольным каменем, я лічу, што ў рэспубліцы ёсць вялізны творчы патэнцыял і Беларусь можа забяспечыць канкурэнтаздольныя інжынерныя паслугі.

## Прадпрыемствы-гіганты: лакаматывы ці ланцугі?

Таксама Аляксей Шкадарэвіч выказаў меркаванне, што вельмі вялікую ролю ў экспарце маюць беларускія прадпрыемствы-гіганты, і дзяржава павінна іх падтрымліваць. Але Свен-Олаф Нэвіяк з такім пунктам гледжання не пагадзіўся:

— Прадпрыемстваў-гігантаў цікавяць кантракты на вялікія сумы. А калі такіх кантрактаў раптам не будзе, то што тады? У Беларусі сёння практычна не развітыя вытворчыя структуры ў галіне малога і сярэдняга бізнэсу. Але калі паглядзець на развітыя краіны Еўропы, там асноўная імпартная структура — не гіганты, а малыя і сярэднія прадпрыемствы, якія ніколі не будуць асноўнымі партнёрамі для беларускіх гігантаў. Возьмем для прыкладу Германію — там амаль 2/3 экспарту робяць не «Сіменс» з «Мерседэсам», а малы і сярэдні бізнэс, які мае канкрэтнае ўяўленне, што зараз патрэбна. Вы кажаце, што роля гігантаў вельмі вялікая, а я лічу, што яны замінаюць развіццю эканомікі Беларусі. Бо яны адцягваюць усе бюджэтныя рэсурсы, якіх потым не хапае на іншае. Зноў жа, каб не зразумелі мяне няправільна, я не супраць, каб эканоміка мела свае флагманы — у той жа Германіі ёсць «Сіменс» і «Мерседэс», але іх эканамічная роля мізэрная для самой Германіі.

Аляксей Шкадарэвіч часткова пагадзіўся са Свенам-Олаф Нэвіякам наконт вялікай ролі малога і сярэдняга бізнэсу ў Еўропе, але адзначыў, што гіганты дасталіся Беларусі ў спадчыну:

— Сапраўды, на Захадзе вельмі развітая кааперацыя, а нам яшчэ трэба многае рабіць па-савецку. Там шмат малых прадпрыемстваў робяць вялікі экспарт, а Беларусі дасталіся гіганты ў спадчыну ад СССР. Гэтыя гіганты зараз усталі з каленяў і працуюць, таму іх трэба падтрымліваць, бо ў сённяшніх рэаліях яны лакаматывы ў Беларусі, пакуль не развіўся малы бізнэс. Нельга ўсё і адразу секчы пад корань, бо будуць вялікія праблемы.

## Знайшоў партнёраў за мяжой — не пашкадуй 300 еўра

Аказваецца, што калі кіраўніцтва краіны паехала з сяброўска-працоўным візітам у іншую краіну, то прадпрыемствы-імпарцёры маюць добры шанец выйсці са сваёй прадукцыяй на рынак гэтай краіны. Прынамсі, Аляксей Шкадарэвіч лічыць, што палітычная падтрымка ў некаторых выпадках вельмі дапамагае:

— Калі адбываюцца візіты высокага ўзроўню, гэта надае вялізны імпульс для двухбаковых адносінаў. Як толькі «цяжкая артылерыя» апрацавала «паверхню», мы адразу туды імкнёмся і стараемся скарыстацца зручным момантам, каб падпісаць кантракты. Вось апошні прыклад, калі я быў у складзе суправаджаючых асобаў у Азербайджан. Месяца не прайшло — і мы падпісалі кантракт, які летась мусоліўся, і ў нас была сур'ёзная канкурэнцыя з усіх бакоў. А тут, дзякуючы візіту Прэзідэнта і яго падтрымцы, мы кантракт падпісалі.

— Але калі нават замежныя партнёры выказваюць поўную зацікаўленасць, трэба ўсё адно рэальна ацэньваць сітуацыю. Сваім досведам у гэтай сферы падзяліўся **Андрэй ВЕЛІЧКОЎСКІ, галоўны спецыяліст па знешнеэканамічнай дзейнасці Беларускай гандлёва-прамысловай палаты**:

— У выпадку добрых палітычных узаемаадносінаў часта складваецца сітуацыі, калі кампаніі вядуць перамовы, замежная кампанія выказвае зацікаўленасць, але, калі разабрацца па сутнасці, то гэтай кампаніі пытанне нецікавае і перамовы яна вядзе толькі каб не ствараць канфліктнай сітуацыі. Такім чынам могуць ісці шматгадовыя перамовы, якія плёну не прынясуць, бо ў аснове няма рэальнай цікавасці. А з вопытам і пры асабістых стасунках ты ўжо пачынаеш бачыць такія бесперспектыўныя выпадкі. Таксама важна максімальна праверыць вашага партнёра. Шмат якія беларускія кампаніі падпісваюць кантракты на дзясяткі тысяч долараў і шкадуюць 300 еўра, каб атрымаць падрабязную даведку пра кампанію-партнёра. Былі прыклады, калі падпісваліся інвестыцыйныя дамовы на сотні тысяч еўра з кампаніяй, статутны капітал якой усяго 1000 еўра, што ў любога чалавека цвярозага розуму павінна было выклікаць насцярожанасць.



Фота Пятра ФАМІНА.

Таксама Андрэй Велічкоўскі расказаў, чым адрозніваецца пошук партнёраў у розных частках свету:

— Заходняя Еўропа — гэта інфармацыйная прастора з высокім пранікненнем інтэрнэту, там ёсць магчымасць знайсці любую інфармацыю пра кампанію як бясплатна, так і за грошы. З гэтага пункту гледжання працаваць з Еўропай прасцей, бо заўсёды можна прагледзець інфармацыйныя каталогі, узяць даведкі ў спецыялізаваных агенцтвах, але праблема ў тым, што заходнееўрапейскія кампаніі ў меншай ступені хочуць працаваць з Беларуссю. Многія не разглядаюць гэты вектар у якасці прыярытэту, а калі і працуюць тут, то ў асноўным у буйных Расіі і Казахстане, дзе вялікія патэнцыйныя рынкі збыту тавараў. Прынамсі, я не магу прывесці прыкладаў, калі буйныя ТНК ствараюць базу па СНД у Мінску.

Што датычыцца паўднёваамерыканскага рэгіёна, то там вялікую ролю іграюць асабістыя кантакты і палітычная падтрымка. Інфармацыйны элемент там значна ніжэйшы, хоць яны і тут імкнуцца за ўсім светам. Калі браць Блізкі Усход, то там інфармацыйныя тэхналогіі не маюць ніякага значэння наогул. Нават пісаць на электронную пошту бессэнсоўна, працуюць толькі асабістыя сустрэчы.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

**ЗАО «РРБ-Банк» сообщает, что 27 июля 2010 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Краснозвездная, 18 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ БАНКА, которое собирается по инициативе Совета директоров Банка со следующей повесткой дня:**

1. Об изменении состава Совета Директоров ЗАО «РРБ-Банк».
2. О выплате дивидендов по привилегированным акциям ЗАО «РРБ-Банк» за II квартал 2010 года.

Форма проведения Внеочередного Общего собрания акционеров ЗАО «РРБ-Банк» – очная.

Реестр владельцев акций, имеющих право на участие во Внеочередном Общем собрании акционеров ЗАО «РРБ-Банк», сформирован на 09.07.2010.

Документы по вопросам повестки дня Внеочередного Общего собрания акционеров (выписку из протокола Совета Директоров, содержащую проект решения по вопросам Внеочередного Общего собрания акционеров) предоставляются по письменному требованию акционеров ЗАО «РРБ-Банк» с 9.30 до 10.00 27 июля 2010 года по адресу: г. Минск, улица Краснозвездная, дом 18. УНП 100361187.

Краіна здароўя
Выпуск
№ 34 (203)

Завочная прамая лінія

# «МЁРТВЫ» ЗУБ — ПАТЭНЦЫЙНАЯ БОМБА, або Смерць наступіла ад зубной інфекцыі

**На пытанні чытачоў адказаў дэкан стаматалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, прафесар кафедры сківічна-тварнай хірургіі Аляксандр ЛАСТАЎКА.**

**(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 17 ліпеня.)**

*☎ — Гродна, Ала. Мне 34 гады. Не так даўно адпакутавала, пакуль рэзаўся, здаецца, апошні зуб мудрасці. Кажуць, што нічога добрага ў такіх зубах няма, ад іх нават імкнуцца хутчэй пазбаўляцца. Што трэба рабіць з такімі зубамі?*

— Сапраўды, існуе меркаванне, што так званыя зубы мудрасці абсалютна не патрэбныя. Абумоўлена гэта можа быць і тым, што перыяд закладкі і прарэзвання такіх зубоў выпадае на перыяд жыцця чалавека, калі падобныя працэсы аслабляюцца і могуць праходзіць не надта паўнавартасна. Тым не менш, дзесьці ў паловы людзей працэс гэты праходзіць нармальна. Больш за тое, зубы мудрасці часам служаць даўжэй за іншыя, і ў рэшце рэшт застаюцца той адзінай магчымасцю, якая дазваляе ўстанавіць мастападобны пратэз. Выдаленне зубоў мудрасці патрабуецца толькі ў выпадку адсутнасці магчымасці іх захавання.

*☎ — Мінск, Аляксей Ягоравіч. У нас прымяняюцца найсучаснейшыя метады пратэзавання. Наколькі ідэальнай можна лічыць імплантацыю зубоў?*

— Дэнтальная імплантацыя — гэта ўжыўленне іншароднага цела, якое імітуе апору для пратэза. Прымяненне такіх сучасных тэхналогій спрыяе ўтварэнню злучэння, якое набліжаецца да фізіялагічнага. Але як і любы іншы метад — гэта таксама не панацэя. У адных такія імплантанты трымаюцца 10 і болей гадоў, а ў іншых страчваюць функцыю ўжо на працягу года. Як і для любога метаду лячэння, для дэнтальнай імплантацыі існуюць пэўныя паказанні і супрацьпаказанні, і ігнараваць іх нельга. Да таго ж, гэта досыць дарагі метад лячэння.

*☎ — Асіповічы, Ала Іванаўна. Сыну 19 гадоў. Апошнія два гады ў яго шчоўкаюць суставы сківіцы, калі ён адкрывае рот. У стаматалагічнай паліклініцы кажуць, што гэта звязана з алергічным рынітам. Няўжо нічога нельга зрабіць у такой сітуацыі? Усё ж такі гэта выклікае пэўныя нязручнасці.*

— Алергія тут ні пры чым... Паталогіяй суставаў займаюцца два спецыялісты стаматалагічнага профілю. Стаматолагі-артапеды, або пратэзісты, і стаматолагі — сківічна-тварныя хірургі. Шчоўканне з'яўляецца за кошт парушэння ў структурах ніжнясківічнага сустава. Гэта могуць быць нейкія змены з боку галоўкі сустава або з боку сустаўнай упадзіны чэрапа, паміж якімі знаходзіцца сустаўны дыск. Часцей за ўсё, шчоўканне тлумачыцца выскокваннем гэтага дыска. У 90 працэнтаў такіх пацыентаў шчаўчок звязаны з зубасківічнымі парушэннямі, з-за таго, што зубы няправільна змыкаюцца. Такое можа ўзнікаць і з узростам. Аднак парушэнні з боку скронева-ніжнясківічнага сустава могуць насіць нават сістэмны характар, калі мае месца рэўматоідны поліартрыт, які пашкоджвае каленныя суставы, суставы кісцяў. І лячэнне тады павінна быць не мясцовым, а агульным.

І ўсё ж у першую чаргу такой праблемай займаюцца артапеды, паколькі лячэнне звязана з карэкцыяй зубных радоў. Праводзіцца пратэзаванне, нават прымяняюцца спецыяльныя артапедычныя канструкцыі, якія карэктуюць такі стан. Бяда ў тым, што паталогія гэта складаная, шматпрофільная і не заўсёды артапеды ахвотна бяруцца за яе. Калі ж артапеды па месцы жыхарства не разбяруцца з праблемай вашага сына, яму трэба звярнуцца для кансультацыі на кафедру артапедычнай стаматалогіі Белдзярмедуніверсітэта, што па вул. Сухой, 28. Можна і непасрэдна да прафесара Навумовіча, загадчыка гэтай кафедры.

*☎ — Барысаўскі раён, Таццяна Вячаславаўна, 54 гады. Спадчынны парадантоз. У 50 гадоў ужо ўсе зубы страціла. Цяпер разбураецца касцявая тканка верхняй і ніжняй сківіцы. Клею пратэзы, але работа звязана з маўленнем. Куды можна звярнуцца з такой праблемай?*

— Вам трэба звярнуцца да стаматолага-артапеда. Добрая фіксацыя здымнага пратэза заснавана на ідэальным супадзенні пратэза з тым рэльефам тканкі, куды ён накладваецца. У працэсе жыццядзейнасці чалавека часткова адбываецца атрафія сківіцы, змяняецца рэльеф пратэзнага ложа, і гэтай адпаведнасці нестае. Тады пратэз пачынае дрэнна трымацца. Таму перыядычна трэба праводзіць карэкцыю або перарабляць пратэзы. На жаль, многія пацыенты лічаць, што дастаткова набыць пратэз адзін раз у жыцці — і праблема вырашана. Трэба мець на ўвазе, што калі пратэз падагнаны не ідэальна, ён сам з'яўляецца прычынай актывізацыі названых парушэнняў.

*☎ — Віцебск, Уладзімір Мікалаевіч. 74 гады. На шчацэ, пад вокам, з'явіўся нейкі тлушчавік. Ён мяне не турбуе. Але ж чым гэта можа пагражаць і што з гэтым рабіць?*

— Тое, што вы называеце тлушчавікам, можа быць і пухлінай, і пухлінападобным працэсам. Трэба паказацца хірургу-стаматолагу або афтальмолагу. Калі будзе вядомы дакладны дыягназ, стане вядома, што варта рабіць з такім утварэннем.

*☎ — Мінская вобласць, Галіна Іванаўна. Дзе можна зрабіць бясплатную карэкцыю носа і ніжняй губы? А калі такую аперацыю робяць толькі платна, то дзе працуюць лепшыя спецыялісты? Ці можна трапіць на прыём менавіта да вас?*

— Выключна ў эстэтычных мэтах мы такой праблемай не займаемся. Хіба яна суправаджаецца функцыянальнымі парушэннямі — ёсць, напрыклад, незмыканне губ, парушэнне насавога дыхання. Калі ж вы хочаце зрабіць эстэтычную карэкцыю, то яна будзе платнай. Звярнуцца па такую дапамогу можна ў Мінскі цэнтр пластычнай хірургіі па вул. Багдановіча або ў іншыя платныя клінікі, дзе выконваюць падобныя ўмяшанні.

*☎ — Брэст, Людміла. Унучцы — 8 месяцаў. На пераноссі бачныя венкі. Ствараецца эфект цёмнай плямы. Гэта можа прайсці ці трэба нешта з гэтым рабіць?*

— Гэта можа быць не проста сасудзісты малюнак. Трэба пераканацца, што там няма дабраякаснай сасудзістай пухліны — гемангіёмы. Звычайна такая пляма выглядае як сіняя або чырвоная ў залежнасці ад таго, за кошт якіх сасудаў харчуецца. Калі пляма цёмная, то «харчуецца» вянознай крывёй, а калі чырвоная, то артэрыяльнай. Трэба паказаць дзіця хірургу-стаматолагу, які пры неабходнасці накіруе вас да адпаведнага спецыяліста.

*☎ — Дзяўчынцы 3,5 года. На пераноссі і лбе — дробныя чырвоныя радзімыя плямкі. Урачы гаварылі, што да года пройдзе. Але не прайшло. Што рабіць?*

— Верагодней за ўсё, размова ідзе пра тую ж дабраякасную сасудзістую пухліну — гемангіёму. Рэкамендацыі ў гэтым выпадку будуць такімі ж.

*☎ — Стаўбцоўскі раён, Антаніна Іванаўна. 60 гадоў. У дзяцінстве ўпала, і на лбе, над вокам, застаўся гузак. Бацькам калісьці гаварылі, што гэтую мяккую тканку можна выдаліць. Але ці можна гэта зрабіць цяпер? Куды трэба звяртацца?*

— Неабходна паказацца хірургу-стаматолагу Мінскай абласной клінічнай бальніцы, які накіруе вас на неабходнае даабследаванне. У выніку траўмы можа мець месца асумкаваная гематома, калі ў тканку трапіла кроў. Калі мела месца пашкоджанне мяккіх тканак, то ў выніку рубцовага працэсу магла ўтварыцца атэрома — кіста сальнай залозы скуры. І нават калі меў месца пералом лобнай косці, магла ўтварыцца мазгавая грыжа. Каб удакладніць гэта, трэба абследавацца.

*☎ — Брэсцкая вобласць, Крысціна Юр'еўна. Дзіцяці 2,5 года. У яго — праліферуючы невус правай шчакі. Размяшчаецца ён каля вуха, там, дзе нерв твару. Хірург у Брэсце сказаў, што гэта гусіная лапка. Невус траўмуецца, таму хацелася б ведаць, ці варта яго выдаляць?*

— Гусіная лапка ніякага дачынення да невусу не мае, паколькі невус закранае толькі глыбіню скуры, іншымі словамі, гэта паражэнне з боку скуры. А гусіная лапка знаходзіцца ў тоўшчы калявушной залозы, значна глыбей. Перш за ўсё неабходна паказацца анколагу.

*☎ — Пінскі раён, Святлана Андрэеўна. Дачцэ 15 гадоў. Калі ёй было гадоў дзевяць, атрымала траўму носа. У бальніцы яго сшылі, але застаўся шрам і сам нос прыўзняўся ўгору. Мы хацелі б зрабіць аперацыю, каб выдаліць заганы. Дзе гэта зрабіць? Колькі каштуе такая аперацыя? У якім узросце лепей яе выконваць?*

— Калі праблема не звязана з функцыянальнымі парушэннямі, то дапамога не будзе бясплатнай. Узрост для карэкцыі значэння не мае. Можна рабіць аперацыю хоць зараз. Звяртайцеся для кансультацыі, калі ласка, у Брэсцкую абласную або Мінскую дзіцячую абласную клініку. Кошт аперацыі будзе вядомы толькі пасля таго, як спецыялісты ацэняць, што і ў якім аб'ёме трэба выканаць.

*☎ — Мінск, Галіна Арлоўская. Чула пра вас вельмі шмат добрага. Дай вам Бог здароўя! А пытанне такое: кажуць, у Маскве пры гаймарытах не робяць праколаў, а прамываюць пазухі серабром. Дакладнай назвы працэдуры я не ведаю. Па расказах саміх хворых эфект вельмі добры. Ці ёсць у нас такая методыка?*

— Праблема з пазухамі можа быць абумоўлена некалькімі прычынамі — запаленнем, кістамі, пухлінамі. Усё гэта можа ўспрымацца як гаймарыт. Таму для таго, каб вызначыцца з лячэннем, заўсёды трэба спачатку ўстанавіць дакладны дыягназ. Для такога абследавання трэба паказацца оталарынголагу.

Каб нечым прамыць пазухі, іх трэба прамыць праз штосьці. Пазуха знаходзіцца ўнутры касцявой структуры. Каб туды трапіць без праколу, патрабуецца эндаскапічнае аптычнае абсталяванне, якім валодае РНПЦ оталарынгалогіі. Бяда ў тым, што не заўсёды магчыма нават гэтай эндаскапічнай оптыкай трапіць у натуральную адтуліну, якая знаходзіцца ў сярэднім насавым ходзе. Таму, каб пазуху прамыць, часцей даводзіцца рабіць пракол.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## СПЁКА НА ТРАІХ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ён + Яна

## ЕЎРАПЕЙКІ НЕ ВЫНОСЯЦЬ ДЭСПАТАЎ

**Жанчынам не падабаюцца дэспаты. Як паведамляе партал «Псіхалагічны навігатар», да такіх высноў прыйшлі італьянскія псіхолагі, апытаўшы 50 тыс. жанчын ва ўзросце ад 25 да 50 гадоў з Італіі, Францыі і Аб'яднанага Каралеўства.**

Тыранства не выносяць 77 % жанчын. Другое месца прадстаўніцы цудоўнай паловы дружна аддалі п'янству (59 %). «Бронзу» заваявала сквапнасць. Супраць скупых мужчын прагаласавалі звыш 38 % жанчын.

Сярод іншых адмоўных якасцяў дамы таксама назвалі неахайнасць, матаўства, слабахарактарнасць і хлуслівасць.

## РАЗВОД АКАЗАЎСЯ ЗАРАЗНЫМ

**Развод валодае «эфектам даміно» і ўплывае не толькі на найбліжэйшы асяродак людзей, якія расстаюцца, паведамляюць амерыканскія вучоныя.**

Група даследчыкаў праанalізавала звесткі 12 тысяч амерыканцаў. Паводле вынікаў даследавання, навукоўцы зрабілі выснову, што рызыка разводу павышаецца на 75 працэнтаў у выпадку, калі разводзіцца хтосьці з сяброў, калег або сваякоў людзей, якія знаходзяцца ў шлюбе.

Аднак, сцвярджаюць спецыялісты, «вірус» разводу таксама распаўсюджваецца праз адно звяно, а менавіта — на найбліжэйшы асяродак сяброў і калег разведзеных. Гэта адбываецца нават у тым выпадку, калі яны не знаёмы з парай, якая вырашыла расстацца. Для «другога звяна» рызыка разводу павышаецца на 33 працэнты. Наяўнасць дзяцей у шлюбе на гэтыя паказчыкі не ўплывае.

Даследчыкі тлумачаць «эфект даміно» так: развод адных падахвочвае іншыя пары паглядзець на свае адносіны крытычна.

## МАМЫ ХВАЛЯЦЦА ДЗІЦЯЧЫМІ ГАРШКАМІ

**Многія маці любяць адзначаць дні нараджэння дзяцей таму, што гэта з'яўляецца выдатнай нагодай паказаць сябе і пахваліцца поспехамі дзіцяці перад іншымі, паказала апытанне, праведзенае на сайце Mum Poll. Паводле меркавання прадстаўнікоў сайта, жанчыны наогул супернічаюць адна з адной больш за мужчын, але маці са скуры вылузваюцца, каб выглядаць лепш за іншых.**

У апытанні ўдзельнічалі 3 тысячы маці. 50 % з іх адказалі, што адчувалі вялікі гонар у тым выпадку, калі іх дзіця пачынала хадзіць, поўзаць, гаварыць або самастойна карыстацца гаршком раней, чым іншыя. Кожная пятая прызналася, што любіць хваліцца перад іншымі жанчынамі сваім любячым мужам. Яшчэ адна прычына для мацярынскага гонару — знешні выгляд пасля цяжарнасці. 27 % жанчын прызналіся, што замучылі сябе дыетамі і фізічнымі практыкаваннямі пасля родаў, а 19 % сказалі, што імкнуліся апранацца лепш за ўсіх.

Між тым, 78 % апытаных прызналіся, што лічаць падобнае выхваляннe смешным, але 38 % з іх дадалі, што не могуць нічога з гэтым зрабіць.

## СЯМЕЙНАЕ ЖЫЦЦЁ — ГАЛОЎНАЯ КРЫНІЦА СТРЭСУ

**Сямейнае жыццё, а не праца з'яўляецца для большасці людзей асноўнай крыніцай стрэсу, паказала даследаванне брытанскіх навукоўцаў.**

Група даследчыкаў апытала 3 тысячы мужчын і жанчын, якія знаходзяцца ў шлюбе.

43 % апытаных сказалі, што падвяргаюцца сур'ёзнаму стрэсу на працы. Астатнія 57 % прызналіся, што найбольшае напружанне адчуваюць не на працы, а дома.

Пры гэтым 18 % жанчын і 12 % мужчын назвалі галоўнай крыніцай дыскамфорту адносіны з партнёрам.

На думку спецыялістаў, сямейныя канфлікты ў вялікай ступені адбываюцца з-за таго, што людзі не ўмеюць пакідаць свае працоўныя праблемы «за парогам».

## АМАЛЬ ТЫДЗЕНЬ У ГОД ЖОНКІ МАРНУЮЦЬ НА БУРЧАННЕ

**Жонкі бурчаць на сваіх мужоў у сярэднім 7920 хвілін у год, што эквівалентна 2,5 гадзінам у тыдзень, 11 гадзінам у месяц або 5,5 дням у год.**

Як паведамляе партал «Вакол Свету», менавіта такімі аказаліся вынікі апытання 3 тыс. чалавек. Прычыны незадаволенасці жонак: нежаданне мужчын выконваць працу па гаспадарцы, ужыванне спіртнога і легкадумнае стаўленне да здароўя. Большасць жанчын (87 %) не саромеюцца сваёй бурклівасці, а большасць мужчын (83 %) часта думаюць, што іх жонкі мелі рацыю, прыдзіраючыся па розных падставах.

Даследчыкі адзначаюць: хоць бурклівасць з'яўляецца непажаданым аспектам узаемаадносінаў, такая стратэгія даволі эфектыўная. Амаль палова апытаных мужчын заявілі, што саступаюць жонкам праз гадзіну, калі яны працягваюць іх «пілаваць», а 21 % паведамілі, што капітулююць перад жонкамі праз пару гадзін, каб у доме запанавала цішыня.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Жаночыя сакрэты

# Галавамыйка па навуцы!



**Валасы здаюцца неахайнымі, цьмянымі, выглядаюць тлустымі ўжо ўвечары, нават калі вы памылі галаву з раніцы? Хутчэй за ўсё, прычына — у няправільным доглядзе. Магчыма, вам не падыходзяць шампунь, кандыцыянер або маска. Калі мыццё галавы стала для вас кашмарам, прыслухайцеся да рэкамендацый прафесіяналаў.**

Мыеце валасы кожны дзень або два разы на дзень — раніцай і ўвечары? Занадта частае мыццё, калі вы няправільна падабралі шампунь і кандыцыянер, не толькі бескарыснае, але і шкоднае. Рэч у тым, што калі шампунь вам не падыходзіць, і вы часта яго выкарыстоўваеце, скура галавы перасушваецца, і гэта з'яўляецца сігналам да яшчэ больш інтэнсіўнай работы тлушчавых залоз. Чым больш вы стараецеся, тым больш неахайна выглядаюць вашы валасы.

Перад мыццём карысна ўцерці ў скуру галавы кіслае малако або сок алоэ. Для тлустых валасоў добра падыходзяць шампуні з экстрактамі крапівы, шалфею, падбелу, палявога хвашчу, кары дубу, календулы, марскіх водарасцяў, кітайскага лімонніку, а таксама спецыяльныя лекавыя шампуні.

Пасля бальзаму-апаласкальніка прамыйце валасы адварам гаючых траў: шышак хмелю, крапівы, кораня лопуху: 2 ст. лыжкі травы заліце літрам кіпеню, закіпяціце і дайце пастаяць 20 хвілін, затым працадзіце.

Цёмныя валасы лепш за ўсё апалоскваць вадой з воцатам (1 ст. лыжка на літр вады), а светлыя — настоем рамонку (2 ст. лыжкі на 2 літры вады) з дабаўленнем лімоннага соку або лімоннай кіслаты.

Калі валасы вельмі тлустыя, дадайце ў ваду для апалоскавання нашатырны спірт з разліку 1 ч. лыжка на літр вады.

Валасы не рэкамендуецца расчэсваць занадта часта — дастаткова трох разоў на дзень, паколькі частае расчэсванне стымулюе тлушчавыя залозы. Пасля расчэсвання абавязкова прамыйце расчоску з шампунем пад гарачай праточнай вадой. Інакш тлушч, які застаўся на ёй, зноў патрапіць на валасы.

Існуе меркаванне, што шампунь трэба мяняць кожныя 3—4 месяцы, каб валасы да яго не прывыкалі, каб не з'яўлялася перхаць. Касметолагі гэтага не пацвярджаюць. Наадварот, яны лічаць: калі вы падабралі шампунь і іншыя сродкі па доглядзе валасоў, які сэнс зноў эксперыментаваць?

І яшчэ адзін момант — сачыце за харчаваннем. Калі валасы хутка забруджваюцца, скараціце ўжыванне салодкага, кавы, алкаголю, тлустых прадуктаў, вяндліны. Вам вельмі карысныя вітаміны В і С, а таксама вітамінныя комплексы з утрыманнем жалеза і серы.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Эпіднагляд

# КУЛЕКСЫ ВЫБІРАЮЦЬ ВЯЛІКІЯ ГАРАДЫ



**Кожнае лета жыхары гарадскіх кватэр пакутуюць ад нашэсця надзвычай надакучлівых гасцей — дробных камароў. Гэтыя насякомыя не толькі раздражняюць сваім начным піскам, балюча кусаюцца і прымушаюць бясконца чухацца — яны яшчэ могуць быць прычынай алергічных рэакцый у людзей, схільных да гэтага. Сёлетні год не выключэнне. Больш падрабязна пра гэтых крывасмокаў нам расказала энтамолаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана ЯШКОВА:**

Гэтыя камары адносяцца да так званага роду кулекс. Яшчэ іх называюць гарадскімі камарамі, бо месцам свайго жыхарства яны выбіраюць вялікія гарады. Кулексы вельмі надакучлівыя насякомыя рудога адцення. І хоць яны не малярыйныя, усё ж з'яўляюцца пераносчыкамі іншых інфекцыйных паразітарных захворванняў — такіх, як сібірская язва, бруцылёз, філярытоз, ліхаманка КУ.

Крывасмокі могуць пладзіцца ў пажарных бочках, дробных лужынах, канавах, ямах. З надыходам халадоў большасць з іх гіне, але частка прабіраецца ў памяшканні, дзе цёпла і вільготна.

З падвалаў па вентыляцыйных шахтах камары трапляюць у кватэры. Яны дабіраюцца нават да восьмага-дзявятага паверхаў.

Летам насякомыя могуць разлятацца ў іншыя дамы, знаходзячы сабе новыя месцы выпладу — не толькі падвалы, але і вадаёмы на адлегласці ад 1,5 да 2 кіламетраў. І там зноў адбываецца развіццё кулексаў.

Дамы, дзе выяўлены выплад, стаяць на ўліку на працягу аднаго года. І здымаюцца з яго толькі тады, калі там праведзена дэзінфекцыя, няма вады і камароў. Можа быць праведзена і паўторная апрацоўка.

У рэспубліцы ёсць пабудовы, у якіх на працягу некалькіх гадоў пладзяцца крывасмокі. Але, зразумела, выяўленне выпладу залежыць не толькі ад работы энтамолагаў. Вельмі важна, дзе і як пабудаваны дом. Спецыялісты эпідэміялагічнай службы ўдзельнічаюць у санітарным наглядзе пры будаўніцтве жылля. Перад узвядзеннем дома і выбарам зямельнага ўчастка абавязкова кантралюецца, наколькі глыбока залягаюць грунтовыя воды. Найбольш спрыяльнай для забудовы лічыцца тэрыторыя, дзе грунтовыя воды залягаюць на тры і больш метраў ад паверхні.

***— Што могуць супрацьпаставіць самі гараджане атакам кулексаў?***

— Варта закрыць сеткай форткі, нацягнуць дробнаячэістую сетку на вентыляцыйныя шахты, асабліва калі адбываецца выплад. Летам трэба прымяняць розныя рэпеленты, адпужвальныя рэчывы, электрафумігатары з пласцінкамі фумітокс.

Падвалы павінны быць асветленыя, у іх не павінна знаходзіцца смецце, нечыстоты. Варта адпампаваць ваду з падвала, высушыць памяшканне, правесці дэзінфекцыю. Падвал заўсёды трэба трымаць зачыненым.

Акрамя таго, уваходныя дзверы павінны шчыльна прылягаць да касякоў, вентыляцыйныя адсекі неабходна абараніць здымнымі рашоткамі, а вокны зашкліць. І яшчэ варта ліквідаваць бліжэйшыя дажджавыя лужыны, ямы з вадой. Бо там, дзе вада, там і камары.

**Вольга ШАЎКО.**

### Народная медыцына таксама прапануе раслінныя сродкі супраць крывасмокаў:

**1.** Карані пырніку тройчы ўскіпяціць у 1,5 л вады. Гэтым адварам праціраць скуру.

**2.** На падваконні можна раскласці вату, намочаную ў алеі гваздзіка, эўкаліпта, анісу. Калі няма алергіі, алей можна нанесці на скуру.

**3.** Вазоны з клешчавінай варта паставіць у кожным пакоі.

**4.** Некалькі разоў на месяц праціpайце вокны і дзверы лаўровым алеем.

**5.** Зусім не даспадобы камарам пах чорнай бузіны і зялёнага таматнага бацвіння.

Якасць жыцця

# Шчасце знутры

**Чаму, калі ў нас дрэнны настрой, заўсёды хочацца чаго-небудзь салодкага? Рэч у тым, што некарысны цукар і каларыйны шакалад садзейнічаюць выпрацоўцы сератаніну, так званага «гармону шчасця». Але пакінем такі метад павышэння настрою на крайні выпадак...**

Сератанін — рэчыва, якое з'яўляецца хімічным перадатчыкам імпульсаў паміж клеткамі галаўнога мозга, кантралюе апетыт, сон, эмоцыі чалавека. Для таго, каб сератанін сінтэзаваўся ў арганізме ў нармальнай колькасці, неабходна, каб з ежай паступала незаменная амінакіслата трыптафан — менавіта ён з'яўляецца папярэднікам сератаніну. Таксама для выпрацоўкі «гармону радасці» абавязкова патрэбнае святло, недахоп якога ў зімовую пару і з'яўляецца прычынай такой распаўсюджанай сезоннай дэпрэсіі.

**Функцыі сератаніну:**

- актывізуе вобласці мозга, адказныя за пазнавальны працэс;
- паляпшае рухальную функцыю і павышае мышачны тонус;
- садзейнічае загойванню ран, выдзяляючыся на месцы пашкоджання;
- уплывае на маторыку і сакрэцыю ў страўнікава-кішачным тракце;
- удзельнічае ў працэсе авуляцыі — утрыманне сератаніну (і шэрагу іншых біялагічна актыўных рэчываў) у фалікулярнай вадкасці павялічваецца непасрэдна перад разрывам фалікула, што, відаць, прыводзіць да павелічэння ўнутрыфалікулярнага ціску;
- аказвае значны ўплыў на працэсы ўзбуджэння і тармажэння ў сістэме палавых органаў — павелічэнне канцэнтрацыі гэтага рэчыва ў мужчын затрымлівае наступленне эякуляцыі;
- падымае настрой.

Калі ў арганізме недастаткова сератаніну, любая дробязь можа вывесці з раўнавагі. Недахоп «гармону шчасця» ўплывае нават на ўспрыманне болю.

**ШТО РАБІЦЬ?** Для нармальнай выпрацоўкі сератаніну неабходна харчавацца ежай, багатай на трыптафан і вугляводы, займацца спортам, бываць на свежым паветры, вылучаць дастаткова часу на сон.

**ВАЖНА.** Прычынна-выніковая сувязь паміж колькасцю сератаніну ў арганізме і настроем — двухбаковая. Калі расце ўзровень сератаніну, у нас паляпшаецца настрой, і калі настрой добры — пачынае выпрацоўвацца сератанін.

Лічыцца, што даросламу чалавеку патрабуецца 1—2 г трыптафану ў суткі. Простыя цукры (цукар, пячэнне, цукеркі), якія рэзка павышаюць узровень сератаніну, хутка перапрацоўваюцца, і арганізм пачынае патрабаваць яшчэ больш слодычаў. Калі вам вельмі хочацца паласавацца, лепш з'ешце невялікі кавалак горкага шакаладу, крыху фінікаў або інжыру.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

**УТРЫМАННЕ ТРЫПТАФАНУ Ў ПРАДУКТАХ**

| Прадукт | мг/100 г |
|---|---|
| Сыр галандскі | 790 |
| Соя | 714 |
| Сыр плаўлены | 500 |
| Сачавіца | 284 |
| Гарох, фасоля | 260 |
| Тварог тлусты | 210 |
| Яйкі | 200 |

Садзейнічаюць выпрацоўцы сератаніну вітаміны групы В. Іх шмат у пячонцы, аўсянцы і грэчцы, дражджах. Каб павялічыць узровень «гармону радасці» ў крыві, ешце дыню, бананы, ананасы, гарбузы, слівы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прафілактыка



# 7 прычын сіндрому хранічнай стомленасці

**Паўсядзённыя бытавыя звычкі нярэдка прыводзяць да стомленасці і апатыі. Як вызначылі вучоныя, часцей за ўсё з'яўленню гэтага стану садзейнічаюць сем прычын.**

Першая з іх — **рэгулярнае недасыпанне**. Паводле статыстыкі, у 60-я гады мінулага стагоддзя сярэднестатыстычны чалавек адводзіў на сон 8 гадзін, цяпер — прыкладна 6,5. Людзі сталі менш спаць з-за паскоранага тэмпу жыцця, які вымушае займацца ўсё большай колькасцю спраў. Акрамя таго, павялічылася колькасць людзей, якія пакутуюць ад парушэнняў сну (напрыклад, на фоне стрэсу).

Медыкі даказалі, што недасыпанне, назапашанае на працягу некалькіх дзён, нельга кампенсаваць за адзін раз. Рэч у тым, што недахоп сну на працягу сутак арганізм здольны без шкоды кампенсаваць на наступны дзень. Сістэматычнае неатрыманне «кампенсацыі», на працягу некалькіх дзён запар, прыводзіць да раздражняльнасці, прыгнечанага стану і атлусцення.

**Аматары «пасядзець» на дыеце** таксама рызыкуюць атрымаць сіндром хранічнай стомленасці. Іх можна падзяліць на тры групы. Адны (і іх меншасць) сапраўды ўмудраюцца, вытрымліваючы дыету, расстацца з лішняй вагой. У другіх нічога не атрымліваецца — і яны пакідаюць спробы абмежаваць свой рацыён. Трэція ж без сну і адпачынку падбіраюць сабе ўсё новыя дыеты або пачынаюць адну і тую ж кожны раз спачатку. Менавіта яны, гэтыя ўпартыя аматары дыет, знаходзяцца ў групе рызыкі. Яны пастаянна адчуваюць віну і нездаволенасць за нявыкананыя планы па пахудзенні, спрабуюць пакараць сябе ўсё больш строгай дыетай, пакутуюць ад пастаяннага пачуцця голаду (і часта — ад недахопу важных рэчываў).

**Трэцяя прычына** — хранічныя болі. Даследаванні паказваюць, што паміж пацыентамі з дэпрэсіяй, посттраўматычным сіндромам і хранічным болем ёсць пэўнае падабенства. Гэта так званая дэзаптацыйная рэакцыя, якая выяўляецца ў мышачнай слабасці, зніжэнні апетыту і лібіда, змяншэнні фізічнай актыўнасці, неспакойным сне і паніжэнні канцэнтрацыі ўвагі. Такі чалавек пастаянна адчувае сябе выматаным, знясіленым, і гэта моцна зніжае якасць жыцця.

**Аматары кавы** таксама рызыкуюць замест чаканай бадзёрасці атрымаць адваротны эфект. Усё проста: узнікае эфект прывыкання, для бадзёрасці патрабуецца ўсё большая доза, якую, урэшце, немагчыма пастаянна павялічваць. Акрамя таго, ужыванне напояў з утрыманнем кафеіну ўзмацняе абязводжванне. Тым, каму складана адмовіцца ад звычкі піць па некалькі кубкаў кавы ў дзень, мае сэнс спалучаць іх з піццём вады на працягу дня. Зрэшты, тым, хто абыходзіцца без кавы, вада таксама не пашкодзіць. Дыетолагі раяць выпіваць 8 шклянак вады штодзень.

Аналагічны эфект дае і **ўжыванне энергетычных напояў**. Прымаючы гэты даволі магутны стымулятар, чалавек атрымлівае ўдарную дозу кафеіну, таўрыну і часта жэньшэню. Пасля такой мабілізацыі ўнутраных рэзерваў арганізму патрабуецца аднаўленне і адпачынак.

Да павышанай стамляльнасці прыводзіць таксама **недахоп кіслароду** ад пастаяннага знаходжання ў душным памяшканні, які запавольвае абмен рэчываў. А **малая рухавасць** пры гэтым зусім не прыводзіць да эканоміі энергіі: мышцы без нагрузкі страчваюць тонус, у выніку знікае і энергія. Больш за тое, фізічная актыўнасць зніжае не толькі рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў, але і рызыку ўзнікнення дэпрэсіі і, як высветлілася, уплывае на працягласць жыцця. Даследчыкі Універсітэта Паўднёвай Караліны на працягу 12 гадоў вялі назіранні за групай з 2600 пажылых людзей. Высветлілася, што фізічная актыўнасць уплывае на працягласць жыцця значна мацней, чым нават наяўнасць нармальнага індэкса масы цела. Інакш кажучы, не мае значэння, поўны чалавек або худы: калі ён шмат часу на працягу дня знаходзіцца ў руху, ён пражыве даўжэй.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

## АСЦЯРОЖНА — ЗМЕІ!

**На мінулым тыдні ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі паступілі 6 мінчан, якія пацярпелі ад укусаў змей.**

Як расказаў загадчык аддзялення па лячэнні вострых атручванняў БХМД Андрэй Шмігельскі, апошні такі выпадак адбыўся ў мінулы чацвер. Змяя ўкусіла гараджаніна ў лясным масіве ў Смалявіцкім раёне.

— З надыходам цёплага надвор'я мінчане сталі часцей выязджаць у лес на пікнікі, па грыбы і ягады. Аднак, адпачываючы на прыродзе, мала хто робіць хоць бы самыя простыя меры перасцярогі, — кажа А. Шмігельскі, — і дарма, паколькі ў гарачыню актывізуюцца змеі.

Мінчане, якія паступілі ў бальніцу, пацярпелі ад укусаў гадзюкі, мядзянкі. Часцей за ўсё змеі кусаюць ніжнія і верхнія канечнасці. Смяротных выпадкаў не адзначана.

Андрэй Шмігельскі нагадаў, што калі ўбачылі змяю, не трэба ўцякаць, лепш замерці і дазволіць паўзуну ўпаўзці — першымі яны на людзей не нападаюць. Нельга лавіць змей. Калі ўсё-такі яна ўкусіла, трэба выклікаць хуткую дапамогу і ні ў якім разе не адмаўляцца ад шпіталізацыі. Да прыезду ўрачоў неабходна на працягу 15—20 хвілін адсмоктваць яд з месца ўкусу. Пасля змазаць месца ўкусу антысептыкам, напрыклад спіртам, налажыць павязку і абезрухоўіць пашкоджаную канечнасць. Пацярпеламу рэкамендуецца шмат піць.

**Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА, «Мінск-Навіны».**

**УТВЕРЖДЕНО**
Протокол заседания
Наблюдательного совета
ОАО «АСБ Беларусбанк»
28.06.2010 № 16

БЕЛАРУСБАНК

**ЗАВЕРЕНО**
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
___________ А.Л.Гальперин
19.07.2010

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об открытой продаже облигаций девяносто четвертого выпуска

## Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»

Раздел 1

**ОБЩИЕ СВЕДЕНИЯ ОБ ЭМИТЕНТЕ**

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках)**

Наименование эмитента на белорусском языке:
полное: Адкрытае акцыянернае таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк»;
сокращенное: ААТ «Акцыянерны Ашчадны банк «Беларусбанк» (ААТ «ААБ Беларусбанк»);
наименование эмитента на русском языке:
полное: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (в дальнейшем именуемое «Банк»);
сокращенное: ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк»).

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Место нахождения: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32.
телефон: (017) 218 84 08;
телефон/факс: (017) 222 26 26;
e-mail: info@belarusbank.by.

**3. Номера расчетного и/или валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций**

Покупатели, изъявившие желание приобрести облигации девяносто четвертого выпуска (в дальнейшем именуемые совокупно «Облигации») на внебиржевом рынке, обязаны перечислить Банку денежные средства в безналичном порядке на балансовый счет 4940, код 795 в соответствии с договором открытой продажи Облигаций.

Расчеты при открытой продаже Облигаций на биржевом рынке проводятся в соответствии с регламентом расчетов в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном законодательством, и сроки ее публикации**

Годовой отчет эмитента публикуется в газете «Звязда» в срок не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.

Годовой отчет эмитента по итогам работы Банка за 2009 год опубликован 01.04.2010 в газете «Звязда» (№№ 62 – 63).

**5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**

Депозитарием эмитента является депозитарий Банка (номер государственной регистрации Банка – 056, код депозитария Банка – 005), расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/0385601 (зарегистрирована в реестре лицензий Министерства финансов Республики Беларусь: № 5200-1246-1044, срок действия – до 29.07.2012).

**6. Размер уставного фонда эмитента**

Уставный фонд Банка составляет 2288787859000 (Два триллиона двести восемьдесят восемь миллиардов семьсот восемьдесят семь миллионов восемьсот пятьдесят девять тысяч) белорусских рублей.

**7. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций**

С Проспектом эмиссии облигаций девяносто четвертого выпуска Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» можно ознакомиться на официальном сайте Банка по адресу: http://www.belarusbank.by/.

С копией указанного Проспекта можно ознакомиться визуально в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах, центрах банковских услуг Банка, а также в ОПЕРУ центрального аппарата Банка ежедневно (кроме выходных и нерабочих праздничных дней) в течение операционного дня structural учреждения Банка.

Раздел 2

**СВЕДЕНИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖИ ОБЛИГАЦИЙ**

**8. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение**

Решение о девяносто четвертом выпуске облигаций Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» в соответствии с подпунктом 10.2 Устава Банка принято Наблюдательным советом Банка 28.06.2010, протокол № 16.

**9. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций**

Облигации выпускаются в бездокументарной форме.

Объем эмиссии – 200000000000 (Двести миллиардов) белорусских рублей.

Количество Облигаций – 200000 (Двести тысяч) штук. Облигациям присваивается серия ГЖ94 и номера с 000001 по 200000.

**10. Номинальная стоимость облигации**

Номинальная стоимость Облигации – 1000000 (Один миллион) белорусских рублей.

**11. Цель выпуска облигаций**

Выпуск Облигаций осуществляется в целях привлечения денежных средств юридических лиц и индивидуальных предпринимателей для формирования ресурсной базы Банка.

**12. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям**

Выпуск Облигаций осуществляется Банком по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь в пределах 80 процентов нормативного капитала Банка в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».

**13. Период проведения открытой продажи облигаций**

После опубликования настоящей Краткой информации, заверенной в установленном порядке Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь, Банк проводит открытую продажу облигаций с 20.07.2010 по 19.07.2011, если больший срок не будет определен Правлением Банка. Срок открытой продажи облигаций может быть сокращен в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

**14. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Размещение Облигаций осуществляется путем открытой продажи на внебиржевом рынке и/или в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа) юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям – резидентам и нерезидентам Республики Беларусь (в дальнейшем именуемые «покупатели») в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Для приобретения Облигаций покупатели могут обращаться в филиалы – областные (Минское) управления, филиалы, центры банковских услуг и центральный аппарат Банка. Отделения Банка в продаже Облигаций не участвуют.

Продажа Облигации осуществляется по цене, равной текущей стоимости Облигации, рассчитываемой по следующей формуле:

$$С = Н + Дн,$$ где:

С – текущая стоимость Облигации;
Н – номинальная стоимость Облигации;
Дн – накопленный процентный доход по Облигации.

В день начала открытой продажи Облигаций (20.07.2010) текущая стоимость Облигации равна ее номинальной стоимости.

Накопленный процентный доход рассчитывается по следующей формуле:

$$Дн = (П1 \cdot Н \cdot t1 + П2 \cdot Н \cdot t2 + \ldots + Пn \cdot Н \cdot tn) / (365(366) \cdot 100),$$ где:

Дн – накопленный процентный доход по Облигации;
П1, П2, Пn – ставка процентного дохода (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления процентного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, увеличенной на 1 (один) процентный пункт;
Н – номинальная стоимость Облигации;
tl, t2, tn – количество дней в соответствующей части текущего периода начисления процентного дохода, в пределах которой ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма tl + t2 +….+ tn равна количеству дней, прошедших с даты начала размещения Облигации (даты выплаты последнего процентного дохода) по дату расчета текущей стоимости.

Расчет текущей стоимости производится по каждой Облигации, исходя из фактического количества дней в году. Проценты начисляются за каждый календарный день.

**15. Срок обращения облигаций**

Срок обращения Облигаций – 731 календарный день (с 20.07.2010 по 20.07.2012). День начала размещения и день начала погашения Облигаций считаются одним днем.

**16. Дата начала погашения облигаций**

Дата начала погашения Облигаций – 20.07.2012. Дата окончания погашения Облигаций совпадает с датой начала погашения Облигаций.

**17. Размер дохода по облигациям, условия его выплаты**

По Облигациям установлен переменный процентный доход, выплачиваемый владельцам Облигаций периодически (один раз в три месяца) в дату окончания соответствующего периода начисления процентного дохода в течение срока обращения Облигаций. Ставка процентного дохода по Облигации равна ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения), увеличенной на 1 (один) процентный пункт.

Процентный доход выплачивается на основании реестра владельцев Облигаций путем перечисления в безналичном порядке суммы процентного дохода в белорусских рублях в соответствии с законодательством Республики Беларусь на счета владельцев Облигаций.

Для выплаты процентного дохода по Облигациям депозитарий Банка формирует реестр владельцев Облигаций за пять рабочих дней до даты выплаты процентного дохода.

В случае отсутствия в реестре владельцев Облигаций данных о счетах владельцев Облигаций в белорусских рублях, открытых в уполномоченных банках Республики Беларусь, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете Банка до непосредственного обращения владельца Облигации. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

Величина процентного дохода по Облигации рассчитывается по следующей формуле:

$$Д = (П1 \cdot Н \cdot t1 + П2 \cdot Н \cdot t2 + \ldots + Пn \cdot Н \cdot tn) / (365(366) \cdot 100),$$ где:

Д – процентный доход по Облигации;
П1, П2, Пn – ставка процентного дохода (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления процентного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, увеличенной на 1 (один) процентный пункт;
Н – номинальная стоимость Облигации;
tl, t2, tn – количество дней в соответствующей части текущего периода начисления процентного дохода, в пределах которой ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма t1 + t2 + ……+ tn должна быть равна количеству дней в данном периоде.

Расчет процентного дохода осуществляется по каждой Облигации, исходя из фактического количества дней в году. Проценты начисляются за каждый календарный день.

**18. Период начисления процентного дохода по облигациям**

Период начисления процентного дохода по Облигациям – с 21.07.2010 по 20.07.2012 (с даты, следующей за датой начала размещения Облигаций, по дату начала погашения Облигаций).

Процентный доход за первый период начисления процентного дохода начисляется с даты, следующей за датой начала размещения Облигаций, по дату его выплаты. Процентный доход по остальным периодам начисления процентного дохода, включая последний, начисляется с даты, следующей за датой выплаты процентного дохода за предшествующий период начисления процентного дохода, по дату выплаты процентного дохода за соответствующий период начисления процентного дохода (дату начала погашения).

**19. Даты выплаты процентного дохода**

Процентный доход выплачивается в дату окончания соответствующего периода начисления процентного дохода:

| Порядковый номер периода начисления процентного дохода | Начало периода начисления процентного дохода | Конец периода начисления процентного дохода, дата выплаты процентного дохода | Продолжительность периода начисления процентного дохода (дней) |
|---|---|---|---|
| 1 | 21.07.2010 | 20.10.2010 | 92 |
| 2 | 21.10.2010 | 20.01.2011 | 92 |
| 3 | 21.01.2011 | 20.04.2011 | 90 |
| 4 | 21.04.2011 | 20.07.2011 | 91 |
| 5 | 21.07.2011 | 20.10.2011 | 92 |
| 6 | 21.10.2011 | 20.01.2012 | 92 |
| 7 | 21.01.2012 | 20.04.2012 | 91 |
| 8 | 21.04.2012 | 20.07.2012 | 91 |
| | | ИТОГО | 731 |

В случае, если дата выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму процентного дохода по Облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочим днем в настоящей Краткой информации считаются выходные дни, государственные праздники и праздничные дни, установленные и объявленные Президентом Республики Беларусь нерабочими днями.

**20. Условия и порядок досрочного погашения выпуска облигаций**

В случае приобретения Банком всего объема выпуска Облигаций либо его части до даты окончания срока обращения Облигаций в порядке, определенном пунктом 23 настоящей Краткой информации, Банк может принять решение о досрочном погашении выпуска Облигаций либо его части.

В случае принятия вышеуказанного решения Банк в установленном порядке уведомляет Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь о необходимости исключения из Государственного реестра ценных бумаг (аннулирования) Облигаций данного выпуска либо его части.

**21. Порядок погашения облигаций**

При погашении Облигаций владельцам Облигаций выплачивается их номинальная стоимость, а также процентный доход за последний период начисления процентного дохода (иные неполученные процентные доходы – при их наличии). Погашение Облигаций осуществляется эмитентом в отношении лиц, указанных в реестре владельцев Облигаций, путем перечисления в безналичном порядке причитающихся денежных средств в белорусских рублях на счета владельцев Облигаций в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

В случае, если день погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

В случае отсутствия в реестре владельцев Облигаций данных о счетах владельцев Облигаций, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете Банка до непосредственного обращения владельца Облигаций. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

**22. Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей погашения облигаций**

Для целей погашения Облигаций депозитарий Банка формирует реестр владельцев Облигаций за пять рабочих дней до даты начала погашения Облигаций, указанной в пункте 16 настоящей Краткой информации.

**23. Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения**

В период обращения Облигаций Банк обязуется ежеквартально осуществлять приобретение (выкуп) Облигаций у любого их владельца по цене, равной номинальной стоимости Облигации, в следующие даты: 20.10.2010, 20.01.2011, 20.04.2011, 20.07.2011, 20.10.2011, 20.01.2012, 20.04.2012.

Приобретение Облигаций осуществляется Банком:
на внебиржевом рынке – на основании договора купли-продажи, заключенного между владельцем Облигаций и Банком;
на биржевом рынке – в соответствии с правилами Биржи.

Для продажи Облигаций Банку владельцы Облигаций должны подать в Банк заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:
наименование владельца Облигаций;
место нахождения и контактные телефоны владельца Облигаций;
номер выпуска Облигаций;
количество Облигаций, предлагаемых для продажи;
банковские реквизиты счета для перечисления средств за проданные Облигации;
наименование профессионального участника рынка ценных бумаг, который будет осуществлять продажу Облигаций на биржевом рынке (в случае, если владелец Облигаций не является профессиональным участником рынка ценных бумаг);
подпись уполномоченного лица владельца Облигаций.

В случае, если для осуществления продажи Облигаций Банку владельцу Облигаций необходимо принятие решения соответствующего органа, или получение согласования, или получение разрешения, владелец продаваемых Облигаций обязан заблаговременно принять (получить) данное решение (согласование, разрешение).

Заявление о продаже Облигаций Банку должно быть предоставлено в Банк не позднее пяти рабочих дней до предполагаемой даты продажи Облигаций по факсу (с последующим предоставлением оригинала не позднее трех дней до даты продажи Облигаций), заказным письмом или непосредственно по адресу: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32; факс – (017) 222 26 26. Заявление, предоставленное после указанных сроков, Банком к исполнению не принимается.

В период обращения Облигаций Банк имеет право осуществлять:
приобретение (выкуп) Облигаций в иные сроки по цене, определяемой Банком;
дальнейшую реализацию Облигаций, приобретенных на вторичном рынке;
иные действия с приобретенными Облигациями в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**24. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрещении выпуска Облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь**

В случае запрещения выпуска Облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь, Банк в срок не позднее тридцати дней с момента принятия указанного решения возвращает владельцам Облигаций денежные средства, направленные на покупку Облигаций, с уплатой процентов за пользование денежными средствами по ставке процентного дохода, указанной в части первой пункта 17 настоящей Краткой информации, за текущий период начисления процентного дохода, в котором принято решение о запрещении выпуска Облигаций.

**25. Дата и номер государственной регистрации облигаций**

Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь:
дата государственной регистрации – 19.07.2010;
номер государственной регистрации – 5-200-02-0688.

**Заместитель Председателя Правления Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»** **Г.С. Господарик**

**Главный бухгалтер Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»** **И.П. Лысоковская**

**http://www.belarusbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

# ЧАРНІЦЫ — ЯГАДЫ ДАРАГІЯ



**Такога попыту на чарніцы, як сёлета, даўно не было. У нарыхтоўшчыкаў гэтыя ягады самыя папулярныя і закупачная цана на іх працягвае расці.**

Палешукі кінуліся ў лес па чарніцы, бо за кілаграм ягады плацяць па 6,5 тысячы. Летась кошт чарніц быў значна меншы — 4500 рублёў.

Ажыятаж стварылі нарыхтоўшчыкі, якія хочуць як мага больш закупіць чарніц і ўзнімаюць цану на іх. У ягадны бізнэс уцягваецца ўсё больш індывідуальных прадпрымальнікаў і арганізацый. Напрыклад, сёлета ў Ганцавіцкім раёне іх зарэгістравана 32 — рэкордная колькасць. І калі Ганцавіцкая спажыўтаварыства плаціла за кілаграм чарніц па 6 тысяч, то прадпрымальнікі тут жа цану паднялі на некалькі сотняў рублёў.

У мінулым годзе нарыхтоўшчыкі цану трымалі на адным узроўні — нібы згаварыліся, а сёлета ад былой салідарнасці і следу не засталося — кожны за сябе, і цана на ягаду можа мяняцца на працягу аднаго дня. Канкурэнцыя ўзнікла з-за таго, што чарніц у гэтым годзе не шмат ды і ягады пераважна дробныя. А галоўнае, што нарыхтоўшчыкам ёсць куды збываць чарніцы — калі б на іх не было попыту, то не плацілі б такія грошы.

Чарніцы ўжо больш дарагія, чым маліна, а такога раней не назіралася. На рынку ў Баранавічах за літровы слоік адборнай маліны просяць 5 тысяч, а чарніцы прадаюць па 6000 рублёў. І цану трымаюць — няпоўнае 10-літровае вядро — 55 тысяч, а трохлітровае — 15 тысяч. Але трэба адзначыць, што пакупнікі каля чарніц не тоўпяцца. Падыдуць, пацікавяцца коштам і адыходзяць. Усё мае сваю мяжу.

Высокая цана для людзей, якія хочуць падзарабіць на ягадах, — гэта добра, і ў лес ідуць сем'ямі. А кепска тое, што многія выкарыстоўваюць забароненыя прылады — скрабкі. Пасля такога збору чарнічнікам наносіцца вялікая шкода і налета тут ураджаю ўжо не будзе, бо разам з ягадамі скрабкамі здзіраецца і лісце.

— Калі такім варварскім спосабам збіраць чарніцы, то ў расліны рэзка зніжаецца плоданашэнне. Пра гэта сведчаць вялікія плошчы чарнічніку, на якіх у мінулыя гады ягаду збіралі «механізаваным» спосабам, — сказаў начальнік Ганцавіцкай райінспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксей Сызранцаў.

З года ў год паўтараецца адзін і той жа малюнак і нешта змяніць у гэтым плане няпроста. Калі ў лес выходзяць тысячы зборшчыкаў ягады, то некальскім інспектарам трымаць сітуацыю пад кантролем фізічна немагчыма. Тым больш што інспектары павінны яшчэ сачыць за рыбакамі і паляўнічымі.

Праблема існуе, яна завязаная на тым, што чарніцы даюць у сям'ю дадатковы заробак (а для каго і асноўны), і людзі сезон збору ягадаў імкнуцца выкарыстаць максімальна.

Сезон чарніц неўзабаве закончыцца, а за ім наступіць час журавін. Можа і яны парадуюць палешукоў багатым ураджаем і высокай цаной.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**

**Муз-news**

## «Drum Extasy» шукаюць замену

**Як адзначае лідар, бадай, самага гучнага на беларускай альтэрнатыўнай сцэне гурта Філіп Чмыр, сітуацыя падобная да дэжа вю: Drum Extasy зноў шукае барабаншчыка. На гэты раз — у сувязі з сыходам самага маладога з музыкаў, Аляксандра Кузьміна.**

Патрабаванні да кандыдатаў, сцвярджаюць удзельнікі гурта, застаюцца нязменнымі: пажадана акадэмічная адукацыя, свабоднае валоданне інструментам, альтэрнатыўнае мысленне, гатоўнасць да шчыльнага канцэртнага графіка, пачуццё гумару. Сярод неабавязковых пунктаў — веданне англійскай мовы і наяўнасць вадзіцельскіх правоў. Асобным пунктам пазначаны «рост да 180 см» — відаць, каб будучы ўдзельнік не глядзеў на ўсіх астатніх зверху ўніз. Між іншым, паспрабаваць свае сілы запрашаюцца таксама і дзяўчаты, але вялікай колькасці ахвотных паненак пакуль што не назіраецца... Альтэрнатыўная музыка — не жаночая справа?



## Аня Шаркунова спяе на курорце

**Але гэта будзе зусім не адпачынак, а вельмі адказны і сур'ёзны конкурс — напрыканцы месяца спявачка прадставіць Беларусь на папулярным міжнародным творчым спаборніцтве «Песні мора», што традыцыйна адбываецца ў курортнай зоне блізу Севастопаля.**

Паводле задумы арганізатараў, «Песні мора» павінны стаць годнай альтэрнатывай «Новай хвалі» ў Юрмале, таму да адбору ўдзельнікаў падыходзілі надзвычай скрупулёзна. (Між іншым, летась пераможцай конкурсу стала спявачка Алёша, якая сёлета прадставіла Украіну на «Еўрабачанні» і трапіла ў дзесятку лідараў.)

Як расказаў прадзюсар артысткі Уладзімір Кубышкін, конкурсная праграма будзе ісці цягам двух дзён: удзельнікі павінны «жыўцом» выканаць песню з уласнага рэпертуару і сусветны хіт. У якасці першай Аня абрала правераны хіт «Сэрца прыгажуні», а для другога дня развучыла песню з рэпертуару джазавай спявачкі Эты Джэймс «Pushover». Ацэньваць канкурсантаў будзе прадстаўнічае журы, сярод чальцоў якога чакаюцца Іосіф Кабзон, Мікалай Наскоў, а таксама Раберціна Ларэці. Скончыцца ж конкурс вялізным гала-канцэртам на цэнтральнай плошчы Севастопаля, куды абяцае прыехаць зорны інтэрнацыянал: Патрысія Каас, Томас Андэрс, Нані Брэгвадзэ... У гала-канцэрце, дарэчы, плануецца ўдзел адразу некалькіх прадстаўнікоў Беларусі — акрамя Ані Шаркуновай, сваю творчасць прадэманструюць спявак Герман і гурт «Лас Вегас».

— Аня ўжо месяц рэпеціруе, рыхтуем канцэртныя касцюмы, — расказаў Уладзімір Кубышкін. — На сцэне Аню будзе падтрымліваць балет з чатырох чалавек, за кулісамі — я, а ў зале — невялікая група сяброў, якія і адпачнуць ля мора, і пахварэюць за любімую спявачку.

## Меладзэ знайшоў зорку ў Беларусі?

**Неўзабаве на ўкраінскім тэлеканале «Новы» стартуе рэаліці-праект «Украіна слязам не верыць» — працяглы адбор маладых артыстаў для ўдзелу ў аўтарскім мюзікле прадзюсара і кампазітара Канстанціна Меладзэ. Апошні, дарэчы, вырашыў не абмяжоўвацца ў геаграфіі пошукаў толькі Украінай, абвясціўшы прагляды таксама ў Літве, Латвіі, Эстоніі і Беларусі.**

У прыватнасці, у мінулую суботу сумесна з тэлекампаніяй «Карамболь» прайшоў кастынг у Мінску, у сталічным клубе «Афрыка». «Карамболь» даўно займаецца вялікімі музычнымі і тэлевізійнымі праектамі па заказе буйных расійскіх каналаў, — адзначае прадзюсар кампаніі Уладзімір Максімкаў. — Напрыклад, у 2006 годзе мы сумесна з беларускім каналам «Муз-ТБ» прадстаўлялі тэлепрэмію ў галіне папулярнай музыкі «Муз-ТБ». Цяпер будзем працаваць з такім прафесіяналам шоу-бізнэсу, як Канстанцін Меладзэ — я лічу, гэта вялікая ўдача».

Вакантных роляў у мюзікле ўсяго тры: дзве галоўныя — мужчынская і жаночая (для выканаўцаў 20—26 гадоў), а таксама другасная ўніверсальная, прызначаная для мужчыны ці жанчыны 30—40 гадоў. Кожнаму ўдзельніку кастынгу трэба было падрыхтаваць тэатральны маналог і песню. Іх выкананне ацэньвалі члены журы па акцёрскім майстэрстве, а таксама асабіста прадзюсар шоу, Канстанцін Меладзэ. З усіх прэтэндэнтаў было адабрана 11 чалавек, якія аўтаматычна трапляюць на праект «Украіна слязам не верыць» і працягнуць барацьбу за права сыграць у мюзікле. Сярод шчаслівчыкаў апынулася вядомая беларуская спявачка Вікторыя Алешка.

## Дарыя развівае харызму



**«Я харызматычная!» — такую не надта сціплую заяву спявачка Дарыя зрабіла ў сваёй новай песні, якую першыя слухачы ўжо ацанілі на канцэрце, прысвечаным 5-годдзю прадзюсарскага цэнтра «Спамаш».**

Іранічны тэкст песні «Харызматычная» напісала Кацярына Чарнушэвіч, на музыку і пастаноўку нумара натхнілася сама Дарыя, аранжыроўкай з улікам пажаданняў спявачкі займаўся Юрый Вашчук, — а ў выніку атрымалася завадная і запамінальная песня-жарт. Зрэшты, як мяркуе спявачка, у кожным жарце нямала праўды, і яе новая кампазіцыя за жартоўным тэкстам уздымае як мінімум тры актуальныя пытанні: які насамрэч шоу-бізнэс? што трэба, каб у яго прабіцца — чацвёрты размер бюста, грошы ці сувязі? І нарэшце, пры адсутнасці першых трох умоў ці можа дапамагчы тая самая харызма і талент дабіцца поспеху? Адказы, відаць, кожны знаходзіць самастойна — у тым ліку і пасля праслухоўвання песні Дарыі.

**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**




## ПАНСКАЕ ПРОЗВІШЧА

...Нехта з вядомых пісаў, што тыя, у каго мы вучымся, называюцца настаўнікамі, але не кожны з іх заслугоўвае гэткага імя.

Словы класіка я міжволі ўспомніў, калі слухаў аповед інспектара Фрунзенскай падатковай інспекцыі № 2 г. Мінска Ніны Эдуардаўны Валодзькінай...

Некалі, у дзявоцтве, у дзяцінстве яна была Барынавай. І выдатніцай. Так што падчас праверак настаўнікі ў школе выклікалі менавіта яе. І яна адказвала. Як заўсёды бліскуча. Выключэнне было — ну, хіба адно.

Неяк на ўрок матэматыкі ў іх клас заявіўся інспектар з міністэрства. Настаўнік (хоць, шчыра кажучы, імя гэта ён і не заслугоўваў, бо вучняў за людзей ніколі не лічыў) рашыў паказаць сябе найлепшым чынам. Гэта значыць, выклікаць выдатнікаў.

— Князева, ідзіце да дошкі, — прапанаваў ён.

Але ў класе ніхто не варухнуўся, з-за парты не ўстаў, бо не было тут такога прозвішча. Тады...

— Каралёва, калі ласка, — паправіўся настаўнік...

Зноў гнятлівая цішыня. Вучні разумелі, што ён выклікае Ніну. Дзяўчына таксама гэта ведала, але ж рашыла паквітацца за ўсе абразы і здзекі, зрабіць так, каб выкладчык, які ніколі не ведаў, як завуць яго вучняў, прылюдна сам сябе высек.

Што між тым і адбывалася: лоб настаўніка пакрыўся халодным потам. Пад пільным позіркам інспектара ён нават забыўся, што на стале, пад рукой ёсць класны журнал, што прозвішча — гэта ці іншае — можна знайсці ў ім, і таму цяпер спалохана, неўразумела перабіраў далей:

— Графава?.. Генералава?.. Царыцына...

Калі дайшоў да Буржуевай, клас ужо не проста смяяўся, клас рагатаў. Разам з ім за апошняй партай заходзіўся малады інспектар.

І невядома, чым скончыўся б гэты ўрок, калі б дзверы ў клас не адчыніліся і ў іх не зазірнула ўстрывожаная смехам завуч.

Тут ужо і Ніна не вытрымала, устала:

— Я — Барынава, — сказала яна. — Вы мяне хацелі выклікаць?..

...Кажуць, ніводная добрая справа не застаецца непакаранай. Ніводная дрэнная, упэўнены, таксама.

**Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ,**
*г. Мінск.*

## ТРЫНАЦЦАТЫ НАМЕСНІК

Многае ў жыцці мяняецца: цяпер, прынамсі, купляй, што толькі душа пажадае, ды ў многіх няма за што, уперад жа наадварот — грошы былі (у тым ліку на рахунках калгасаў), а вось магчымасці нешта набыць — ну ніякай. Планавая эканоміка: прыходзіла, паступлялася ў раён што-кольвечы з сельскагаспадарчай тэхнікі, а тут ужо хто выбіў, той і маладзец.

(У малайцах, як правіла, хадзілі мацнейшыя...).

Дык вось: якраз у тыя часы вырвалася ўперад адна з нашых фермаў — на Дошку гонару яе занеслі. І не абы-дзе, а ў Маскве, на ВДНГ! Гэта вам не хухры-мухры! Старшыня калгаса ну вельмі фарсіў, вельмі ганарыўся. А там прыкінуў, што яно грэх не скарыстацца момантам, грэх не зганяць у тую ж Маскву ў міністэрства сельскай гаспадаркі. Раптам, думае, выклянчу — хоць што-небудзь...

Гаспадарцы сенаўборачны комплекс да зарэзу патрэбен быў!..

То як чалавеча надумаў, так і зрабіў. Узяў з сабой перадавога брыгадзіра, удвух паехалі.

І што ж? Цэлы дзень там прыніжаліся, цэлы дзень парогі абівалі, па кабінетах хадзілі, а вынік — нуль без палачкі: нічога не дабіліся.

Плюнулі мужыкі, выйшлі на вуліцу, бачаць — паблізу піўны ларок. Рашылі туды схадзіць — гаркату з душы крыху змыць... Узялі таго піва, стаяць, смакуюць. Але ж гамоняць і тут пра сваё.

Бачаць, мужык, што паблізу стаіць, гутаркай іх зацікавіўся, падсунуўся крыху бліжэй, а тады і кажа: таварышы, я вам магу памагчы, бо працую якраз у тым міністэрстве — трынаццатым намеснікам міністра. Прынамсі, спісы, каму што з тэхнікі выдзеліць, я складаю.

Старшыня калгаса на яго паглядзеў (спіты, плюгавенькі... Ну не сказаць, што бомж, але вельмі падобны...) і адвярнуўся: не можа такі ў міністэрстве працаваць, а брыгадзір — не, не пагрэбаваў: усё як ёсць яму распавёў: і хто яны, і адкуль прыехалі, і па якой патрэбе.

Незнаёмец у адказ: я вашу бяду адной левай... Не, правай развяду — адным росчыркам пяра... Калі толкам «пахмеліце». А калі яшчэ і пачастуеце...

Пераглянуліся вяскоўцы, прыкінулі і так і гэтак, рашылі: а, была ні была — рызыкнём!

Да раніцы хмялілі таго трынаццатага намесніка ў яго ж на кватэры (балазе бабылём той жыў...). Ну і самі, вядома ж, елі, пілі. Пра што назаўтра (галовы баляць, грошы ляснулі...) ды і потым ну вельмі шкадавалі...

Якое ж было здзіўленне, калі праз месяц пасля таго балявання менавіта іх калгасу, «мэтава», прыйшоў той самы жаданы сенаўборачны комплекс.

**У.К. ЛАБКО,**
*в. Дзераўная, Слонімскі раён.*

## НЯНЬКА

У доме маіх бацькоў, лічы, на покуці вісяць дзве вельмі падобныя фатаграфіі. На адной — мой прадзед і прабабуля — у яе на каленях вялікі белы кот. На другой — дзед і бабуля. Таксама з катом — ужо пярэстым.

З імі — з катамі, з коткамі, самых розных афарбовак! — не раз фатаграфаваліся мае бацькі. Ёсць такія карткі і ў мяне, бо ёсць котка — прыгожая, разумная, ласкавая... Непрыемнасць з ёй толькі адна — кацяняты. Але і іх дагэтуль мы прымудраліся неяк раздаваць. Прычым у добрыя рукі. А вось сёлета...

У апошнія радзіны прывяла наша Муся дзвюх пярэстых котачак і чорнага, як вуглік, катка. «Гэта будзе мой... Барс», — адразу сказаў Косця (прыяцель мужа). І з таго разу стаў часцей заходзіць да нас — прывучаць да сябе гадаванца.

Трэба сказаць, што яму гэта ўдавалася. Прычым досыць добра. Каток стаў надчэкваць свайго новага гаспадара (ці злоўленых ім карасікаў?), часам выбягаў насустрач, некалькі разоў нават (цырк на дроце!) па калашыне, па полах пінжака залазіў яму на рукі, на плечы! Аднак, што цікава, рабіў гэта тады, калі чалавек быў... цвярозы. Калі, крый Божа, п'яны (а гэта з Косцем вельмі часта, на жаль, здаралася) — Барсік збягаў, або зашываўся ў кут пад канапай і нават не вылазіў.

— Ах ты паскуда! — спачатку як быццам з любоўю гаварыў Косця.

Потым, як мне падалося, любові ў голасе стала заставацца ўсё меней і меней:

— Мала таго, што жонка пілуе, — злаваў ён на Барсіка, — дык яшчэ і ты туды ж?.. Выхавальнік знайшоўся...

Следам у адрас катка гучала шмат непрыемных слоў. Прычым зусім непраўдзівых, бо што-што, а здольнасці выхавальніка ў Барсіка былі, факт.

Як гэта высветлілася? Раскажу.

У нашай сям'і падрастае двое малых: аднаму пяць гадоў, другому два. Харошыя дзеці. Адно, малодшы як толькі спаць, адразу ў капрызы: то таго хачу, то вось гэтага. З гадзіну тапчуся ля яго, выстачаю... Я...

Іншая рэч... Барсік. Пачуўшы неяк мае словы пра тое, што спаць пара, ён выпісаў вакол малога пару-тройку кругоў, потым падаўся ў бок калыскі.

Малы (ці трэба казаць?) з радасцю рушыў следам, лёг у свой ложак, і заснуў пад кацінае «курняў» куды хутчэй, чым пад кніжкі-калыханкі. Раз, потым неяк яшчэ раз, яшчэ...

Вы здагадаліся, што аддаць такую «няньку» (а тым больш у не вельмі надзейныя рукі) наша сям'я не змагла — пакінула катка сабе. Праўда, ён, як толькі зразумеў гэта, трохі разбэсціўся і ўкладваць дзіця дапамагае зрэдку, але такое ўсё ж па-ранейшаму здараецца!

**Алена І.**
*Бабруйскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

# ШЫРОКАЯ ГАРА



Лагойскі раён.

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 18 (643)
аддзел рэкламы 287 17 79

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПРАДАЕЦЦА

❒ Матацыкл ІЖ-Юпіцер 8, станок дрэваапрацоўчы трохфазны.
МТС 8 033 601 87 81.

❒ 7 сем'яў пчол, в. Новая Вёска, Стаўбцоўскі раён.
Тэл. 8 029 9221563.

❒ Інвалідная каляска з электрапрывадам.
Тэл. 8 029 9508136.

❒ Карова джэрсейскай пароды.
Тэл. 8 02154 33 634.

❒ Зааненская каза, два акоты, і козачка 3 мес., г. Бялынічы.
Тэл. 8 022 3237550.

❒ Хата 11х7 м, можна пад знос, вёска Галынь, Навагрудскі р-н, Гродзенскай вобл.
Тэл. 71 4 79, МТС 253 35 69.

### КУПЛЮ

❒ Дом у вёсцы да 20 км ад МКАД у любым стане і а/м маладзей чым 1990 г. ВАЗ ці імпартны.
Тэл. 8 025 6548116.

❒ Трактар МТЗ.
Тэл. 8 044 473 68 90.

❒ Дом у вёсцы за 20 км ад МКАД у любым стане і а/м да 1990 г. (ВАЗ ці імпартны).
Тэл. 8 025 6548116.

### РОЗНАЕ

❒ Мяняю самаробны трактар (рухавік дыз.-25) на мотаблок.
Тэл. 8 029 5837727.

ЗВЯЗДА
КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя______ №__________ Выдадзены ______________________________

Подпіс _______________ Дата _________

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

### СМЕЛАСЦЬ ГАРАДЫ БЯРЭ

Наш масавы конкурс для шашыстаў усіх рангаў «Пагода ў доме»-7 працягваем камбінацыйнай праблемай. У ёй у белых на дзве шашкі меней, але, як кажуць, смеласць гарады бярэ. Праявіце яе і вы пры рашэнні задання № 11. Першы ход белых:



**Белыя**: f6, g5, g7, h2, h6 (5). **Чорныя**: a3, b2, c7, d4, e3, e5, f2 (7).

### ЭЦЮДЫСТЫ НАТХНЯЮЦЦА ФОРМАМІ

У аўтарскім конкурсе-12 заданні некалькі складаныя, бо ён больш разлічаны на першакласных рашальнікаў. Аднак калі знайсці першы правільны ход, дык і яны не так ужо цяжка развязваюцца. Іх стваральнік — майстар кампазіцыі Пётр Шклудаў (Наваполацк) надае ім не толькі багаты змест, але і прывабную форму. Паракайнайцеся ў гэтым на яго чарговым эцюдзе:



№ 4. **Белыя**: a7, f2, дамка g1 (3). **Чорныя**: b4, e5, f6, g5, g7 (5). Перамога белых.

### ФІЛІГРАННАЯ ТЭХНІКА

Яе дасягае ў сваіх работах гросмайстар СССР Леанід Вітошкін (Гомель). У якасці бліца-55/3 ён прапануе наступную з іх:



**Белыя**: 9, 13, 17, дамкі 6, 42, 47 (6). **Чорныя**: 16, 32, 41, дамка 36 (4). Замкнуць простую чорных.

Па-за конкурсам разгледзьце і такія яго задумкі, якія ён даслаў у рэдакцыю:

№ 1 (мініяцюра). **Белыя**: a7, b6, d2, f6, h6 (5). **Чорныя**: b4, b8, d4, e5, f2, f8 (6).

№ 2 (праблема). **Белыя**: a1, a5, b4, c7, d6, e1 (6). **Чорныя**: b8, c3, d2, e5, f4, g3, g5 (7).

№ 3 (эцюд). **Белыя**: d4, дамкі c5, h8 (3). **Чорныя**: f4, h4, дамкі a1, g1 (4).

Ва ўсіх іх белыя пачынаюць і выйграюць.

№ 4 (задача). **Белыя**: a1, b6, c1, e3, g1, g5, дамкі a5, c3, c5, d6 (10). **Чорныя**: a3, a7, g7, h2, h8 (5). Узяць у палон дамку і дзве простыя чорных.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі.**

## УЖО ПАЎСОТНІ АХВЯРАЎ КУПАЛЬНАГА СЕЗОНУ НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ

**З 15 мая, калі адкрыўся сезон купання, на вадаёмах Магілёўскай вобласці загінулі больш за паўсотні чалавек. З іх, паведамілі ў абласной арганізацыі ратавання на водах, чацвёра дзяцей.**

Толькі за адзін дзень 15 ліпеня патанулі 4 чалавекі. Пра гэтыя выпадкі расказаў вадалазны спецыяліст Андрэй Кунцэвіч:

— Раніцай каля возера ў вёсцы Дубінка Магілёўскага раёна адпачывала і выпівала кампанія: 28-гадовы мужчына, які нідзе не працаваў, зайшоў у ваду па пояс, нырнуў і больш не паказаўся на паверхні. Яго цела пазней выцягнулі вадалазы.

У Мсціслаўскім раёне на возеры ў вёсцы Андраны адпачываў з сябрам 53-гадовы мужчына, і сяброўскія гутаркі не абышліся без алкагольнага напою. Вырашылі паплаваць, мужчына стаў тануць, і калі сябра выцягнуў яго на бераг, то прывесці ў прытомнасць ужо не здолеў.

У Клімавічах увечары 28-гадовы мужчына з сябрам вырашылі асвяжыцца пасля працоўнага дня і зайшлі на возера, якое месціцца проста ў раённым цэнтры паблізу вуліцы Горкага. Мужчына нырнуў з драўлянай кладкі, але глыбіня вады там была недастатковая для такога скоку, і цела ўсплыло адразу.

У Асіповіцкім раёне на рацэ Бярэзіна патануў 63-гадовы рыбак. Мужчына на абодвух берагах ракі выставіў вуды, і пераплываў Бярэзіну, каб сачыць за імі. На вачах жонкі ён, не даплыўшы некалькі метраў да берага, рэзка пайшоў пад ваду...

Спёка гоніць людзей у ваду таму выратавальнікі просяць не купацца ў неабсталяваных месцах, сачыць за дзецьмі і не ісці ў ваду нецвярозымі.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Факт

### Гадаванцы сталічнага заапарка адпачываюць і наталяюць смагу

**Моцная гарачыня, якая вось ужо некалькі дзён трымаецца ў сталіцы, прымушае выхаванцаў Мінскага заапарка да захаду сонца хавацца ў сваіх доміках, а таксама піць удвая больш вады. Пра гэта карэспандэнту агенцтва «Мінск-Навіны» расказала намеснік дырэктара заапарка Наталля Лебедзева.**

Паводле яе слоў, у сувязі са спякотай звяры сталі менш актыўнымі, нават такія аматары гарачыні, як, напрыклад, сервалы, ламы. Таксама стараюцца схавацца ў цені або ў сваіх доміках рысі, тыгрыца, леапарды. Лепш за ўсіх пераносяць спякоту птушкі і вярблюдзіца.

Наталля Лебедзева адзначыла, што асаблівых прычын хвалявацца за стан жывёл у супрацоўнікаў заапарка няма. Галоўнае, каб у гадаванцаў заўсёды было шмат халаднаватай пітной вады. Рацыён жывёл у спёку не змяніўся.

**Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА, «Мінск-Навіны».**

### Дом для медыкаў

**У Смаргоні пабудавалі пяціпавярховы дом спецыяльна для сем'яў трыццаці медыцынскіх работнікаў — урачоў, медсёстраў і санітарак.**

Такое рашэнне мясцовыя ўлады прынялі дзеля таго, каб медыцынскія кадры, якіх за апошнія гады прыехала нямала, не пакідалі раён з-за адсутнасці жылля. Таму для медыкаў, якія раней стаялі ў агульнай жыллёвай чарзе, стварылі кааператыў, і менш чым за год пабудавалі дом. На ўрачыстай цырымоніі з нагоды яго засялення старшыня райвыканкама Мечыслаў Гой уручыў сімвалічны ключ старшыні кааператыва Марыне Капцюх, кожная сям'я навасёлаў атрымала падарунак ад адміністрацыі Цэнтральнай раённай бальніцы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### Абуліся і апрануліся

**Каля в. Барысава (Кобрынскі раён) супрацоўнікамі міліцыі і Брэсцкай мытні затрыманы жыхар г. Беразіно, які без адпаведных дакументаў перавозіў на аўтамашыне «Мерседэс-Віто» абутак і адзенне імпартнай вытворчасці.**

Кантрабанда пацягнула 120 млн рублёў, але ў в. Чарняны (Маларыцкі раён) было канфіскавана абутку і адзення яшчэ больш. Беспрацоўны з Крычава перавозіў 21 баул з кантрабандай, якую ацанілі ў 200 млн рублёў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### Грэйдарам па каноплях

Плантацыю маку вырошчваў на сваім асабістым падворку 60-гадовы грамадзянін з вёскі Катлавіца Брагінскага раёна. Міліцыянеры, якія знайшлі шчодры ўраджай зелля, склалі пратакол і знішчылі 300 кг расліны. У Добрушскім раёне безгаспадарныя каноплі ў вялікай колькасці раслі на закінутай ферме ў адселенай вёсцы Бярозкі. На прошчы 0,7 га расліны прыйшлося знішчаць з дапамогай грэйдара. Больш за тону зялёнай масы было спалена.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### Не дачакаліся атамнай атакі

**У Баранавічах адбыўся суд над двума хлопцамі, якіх абвінавацілі ў выкраданні псіхатропнага рэчыва тарэн.**

Прэпарат з'яўляецца моцным абязбольваючым і ў свой час назапашваўся на выпадак атамнай ці хімічнай атакі.

На адным прадпрыемстве харчовай прамысловасці горада капсулы з тарэнам захоўваліся ў ваенных індывідуальных аптэчках у кабінеце грамадзянскай абароны.

Хлопцы зазірнулі ў тыя аптэчкі і прыхапілі прэпарат. За гэта суд Баранавіцкага раёна і горада прысудзіў кожнаму з іх па 3,5 года калоніі ўзмоцненага рэжыму.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»**
извещает своих акционеров, что 2-ая выплата дивидендов по итогам финансово-хозяйственной деятельности за 2009 год будет осуществляться по адресу:
**г. Минск, ул. Богдановича, 129 и почтовыми переводами.**
Справки по тел.:
**(017) 334 30 31, 334 34 74.**
УНП 100364117

**г. ВИТЕБСК** **25.08.2010**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА**

**НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА ДО 50 %**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 2 | Здание склада с рампой, расположенное по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Боровая, д. 11, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение инв. № 250/С-27777 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), одноэтажное кирпичное, 1985 г. постройки, фундамент бетонный, перекрытие ж/бетонное, крыша рулонная, общая площадь 1030 кв.м, объем 5232 куб.м, бетонная рампа, площадь 95 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 243500000001001208 для содержания и обслуживания здания вещевого склада, площадь 0,4656 га, срок аренды 25 лет. Использование – под специализированное здание здравоохранения и предоставления социальных услуг. | **212 911 300** | **21 291 130** |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.**

**1. Аукцион состоится 25.08.2010 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 24.08.2010 г. по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 25.08.2010 г. с 14.00 до 15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

4. **Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка, внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 3-х миллионов рублей, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

5. Подробная информация об условиях аукционов, порядке участия и проведения аукционов опубликована ранее в газете «Звязда» № 164 (26522) от 02.09.2009.

**Извещение о проведении аукциона по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в Поставском районе Витебской области**

| Дата, время, место проведения аукциона | 24 августа 2010 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, III этаж, каб. 58) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Адреса, площади, кадастровые номера земельных участков, начальная цена | №№ лотов | Адреса участков | Площадь, га | Кадастровый номер | Наличие ограничений в использовании | Начальная цена, рублей | Сумма подлежащих возмещению организатору аукциона расходов на его проведение |
| | 1. | Яревский сельсовет хутор Заготскот, ул. Полевая, д. 5 | 0.2480 | 224085304101000005 | водоохранная зона озера Задевское | 8 000 000 | 1 282 466 |
| | 2. | Яревский сельсовет д. Задевье, ул. Озерная, д. 10 | 0.2282 | 224085304601000016 | водоохранная зона озера Задевское | 3 000 000 | 1 329 323 |

| | |
|---|---|
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона | - внесение победителем аукциона в местный бюджет платы за право частной собственности на земельный участок в размере, заявленном на торгах;<br>- возмещение Яревскому исполкому расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельных участков, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельных участков;<br>- государственная регистрация права на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;<br>- занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации |
| Порядок осмотра на местности земельных участков, которые предполагается передать в частную собственность по результатам аукциона | В рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11 |
| Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона до его начала | - заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе);<br>- квитанция об уплате задатка;<br>- ксерокопия стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования;<br>- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность |
| Место, дата и время начала и окончания приема заявлений | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. № 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 со дня публикации извещения до 20.08.2010 включительно |
| Размер задатка, срок и порядок его внесения | 10 % от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет Яревского исполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе |
| Адрес и номер контактного телефона комиссии | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. № 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00), телефоны 8 (02155) 43180, 41132 |

УНП 300085907.

**РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
- **оценка имущества (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, вреда от залития, пожара и др.)**
- **организация и проведение аукционов**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ГЛУБОКСКИЙ АГРОСЕРВИС»**

**ЛОТ:** склад запчастей, инв. № 220/С-12742, пл. 75,8 кв. м; склад производственный, инв. № 220/С-12743, пл. 503,0 кв.м; склад кирпичный, инв. № 220/С-12740, пл. 10,7 кв.м; здание диспетчерской, инв. № 220/С-12751, пл. 52,9 кв. м; здание мастерской (2-этажн.), инв. № 220/С-12746, пл. 1059,6 кв.м; контрольно-пропускной пункт, инв. № 220/С-12754, пл. 20,0 кв.м; арочник, инв. № 220/С-12750, пл. 1024,4 кв.м; навес для машин, инв. № 220/С-12745, пл. 1660,9 кв.м; гараж для легкового транспорта, инв. № 220/С-12759, пл. 47,3 кв.м; здание котельной, инв. № 220/С-12752, пл. 254,2 кв.м по адресу: Витебская область, Глубокое, ул. Минская, 91, начальная цена продажи с учетом НДС **544 438 200** руб., задаток 54 443 820 руб., для обслуживания выделен земельный участок пл. 5,5516 га, кадастровый № 221550100010000036. **Условие** – создание покупателем объектов придорожного сервиса, гостиницы.

Аукцион состоится **3 августа 2010 в 12.00** по адресу: Витебская область, Глубокое, ул. Дзержинского, 19. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 до 02.08.2010 (включительно) по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация участников 03.08.2010 с 11.30 до 12.00 по месту проведения аукциона. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением, разработанным в РУП «Витебский институт недвижимости и оценки». Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Порядок участия и проведения аукциона опубликован на сайте www.Ocenka.by.

Официальное извещение опубликовано в газете «Народнае слова» от 15.05.2010 г. № 53.

**Дополнительную информацию можно узнать по телефонам: 8 (0212) 435 435, 435 495; 8 (029) 591 00 02.**

**ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ**

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 30 июля 2010 года проводит 10-й повторный на 11 открытом аукционе по продаже имущества республиканской собственности**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км/наработка в м/ч (износ) | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 74. | Топливозаправщик ТЗА-7,5-5334, с/о № А9041538 на а/шасси МАЗ-5334 ш. 127486, дв. 9023102, 4 кат. | н.п. Михановичи, в/часть 52188 | 1990 | 53545 1991 м/ч | 26 000 000 | 2 600 000 |
| 75. | Топливозаправщик ТЗА-7,5-5334, с/о № А9041533 на а/шасси МАЗ-5334 ш. 127337, дв. 9022298, 4 кат. | н.п. Михановичи, в/часть 52188 | 1990 | 41673 926 м/ч | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 76. | Автотопливомаслозаправщик АТМЗ-5-4320, с/о № 1610 на а/шасси УрАЛ-4320-1012, ш. 031170, дв. 681644, 4 кат. | г. Михановичи в/часть 52188 | 1984 | 14097 2987 м/ч | 53 000 000 | 5 300 000 |
| 77. | Автотопливомаслозаправщик АТМЗ-5,5-4310, с/о № 890234 на а/шасси КамАЗ-4310, ш. 0056945, дв. 0386657, 4 кат. | г. Михановичи в/часть 52188 | 1989 | 12301 1664 м/ч | 48 000 000 | 4 800 000 |
| 78. | Автотопливомаслозаправщик АТМЗ-5,5-4310, с/о № 890340 на а/шасси КамАЗ-4310, ш. 0058813, дв. 0404411, 4 кат. | г. Михановичи в/часть 52188 | 1989 | 10174 448 м/ч | 53 000 000 | 5 300 000 |
| 79. | Автоцистерна АЦ-8-5334, с/о № А8730666 на а/шасси МАЗ-5334, ш. 98844, дв. 802848, 4 кат. | г. Михановичи в/часть 52188 | 1987 | 30424 284 м/ч | 36 000 000 | 3 600 000 |
| 80. | Электростанция ЭД2х30/Т400-1РАМ1 № ПТ1545КВВМ на КамАЗ-43101, ш. 0034761, дв. 0129165, 4 кат. | г. Береза в/часть 23324 | 1988 | 14128 66 м/ч | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 81. | Автотопливомаслозаправщик АТМЗ-4,5-375, с/о № 800409 на а/шасси УРАЛ-375, ш. 322430, дв. 121547, 4 кат. | г. Михановичи в/часть 52188Ф | 1980 | 1562 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 82. | Автоцистерна АЦ-5,5-375 с/о № 8205050 на а/шасси УРАЛ-375, ш. 375955, дв. 639408, 4 кат. | г. Михановичи в/часть 52188Ф | 1982 | 1192 | 14 000 000 | 1 400 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00 **30 июля 2010 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 **28 июля 2010 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **30 июля 2010 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел. (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com.**

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2010 г.

ОАО «Белорусский народный банк» (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2010 | 01.07.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 3 851,4 | 3 464,4 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 794,0 | 2 330,1 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | 31 969,7 | - |
| | для торговли | 11031 | - | - |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | - | - |
| | в наличии для продажи | 11033 | 31 969,7 | - |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 16 794,3 | 14 305,6 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 65 203,7 | 45 086,2 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 77,8 | 3,8 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 28 957,1 | 27 901,8 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 3 258,6 | 1 424,0 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 152 906,6 | 94 515,9 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | - | - |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 20 450,8 | 5 381,2 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 25 499,9 | 28 858,0 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | - | - |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 604,7 | 926,7 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 46 555,4 | 35 165,9 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 69 219,7 | 25 294,7 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 3 996,3 | 3 996,3 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 11 437,0 | 9 484,7 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 21 698,2 | 20 574,3 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 106 351,2 | 59 350,0 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 152 906,6 | 94 515,9 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 140 100,1 | 85 998,3 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 7 905,7 | 8 997,6 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2010 г.

ОАО «Белорусский народный банк» (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2010 | 01.07.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 8 527,4 | 4 561,6 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 837,8 | 1 838,8 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 7 689,6 | 2 722,8 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 1 560,4 | 1 523,8 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 235,3 | 180,2 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 325,1 | 1 343,6 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 909,2 | 2 208,7 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | - | - |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 1 728,0 | 1 464,0 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 1 271,9 | 355,4 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 6 927,2 | 4 403,3 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 579,7 | 565,3 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 442,4 | 105,7 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 518,5 | 92,2 |

**Генеральный директор** **К. Церетели**
**Главный бухгалтер** **Т.П. Лаврова**
**Дата подписания 2 июля 2010 г.**

Лицензия № 10 на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком РБ 27 августа 2008 г.


Фота Сяргея АЛЯКСАНДРАВА.

**НАСУПЕРАК больш як 30-градуснай спякоце ў мінулую суботу на вадасховішчы Дуброўскае (Мінскі р-н) рыбаловы-аматары правялі спаборніцтвы па паплавочнай лоўлі сярод «неспартсменаў». Нягледзячы на тое, што ўдзельнічалі толькі непрафесіяналы, вынікі атрымаліся даволі значныя -- да 5 кілаграмаў рыбы за некалькі гадзін. На здымку адзін з арганізатараў свята рыбалкі і ўладальнік другога месца Сяргей Шалькевіч.**

# У гарачы час года лепш адмовіцца ад касметыкі на алейнай аснове

**Пра гэта сказала візажыст, суддзя рэспубліканскай і міжнароднай катэгорыі па дэкаратыўнай касметыцы Таццяна Іванова.**

Летам пажадана карыстацца касметыкай з абаронай ад ультрафіялетавага выпраменьвання. Танальны крэм у гарачыню можна выкарыстоўваць толькі ў выпадку неабходнасці, лічыць Таццяна Іванова. Замест яго лепш абысціся лёгкай празрыстай пудрай. Калі ж вы карыстаецеся румянамі, то трэба ўзяць крэмападобныя.

Асаблівыя патрабаванні ў гарачы час года прад'яўляюцца і да ценяў — яны павінны быць лёгкімі. Крэмападобныя цені збіраюцца ў складцы павек і псуюць увесь макіяж. Брунеткам візажысты рэкамендуюць паэксперыментаваць з яркімі тонамі, бландзінкам жа лепш выкарыстоўваць спакойныя пастэльныя колеры. «У гарачыню, калі касметыка кепска трымаецца на твары, лепш выбраць натуральны макіяж. Асноўныя плюсы — мінімум касметыкі, якая выкарыстоўваецца, і яго не трэба карэкціраваць на працягу дня. Акрамя гэтага, натуральны макіяж можна лёгка ператварыць у вячэрні», — адзначыла спецыяліст.

А вось туш, на думку Таццяны Івановай, у гарачыню лепш не выкарыстоўваць. «На лета можна фарбаваць вейкі і бровы хімічнымі фарбавальнікамі — эфект будзе доўгім і туш не спатрэбіцца, — лічыць яна. — Тым больш што ў летнія месяцы многія дзяўчаты карыстаюцца спрэем для скуры, які ўвільгатняе».

Каб не сапсаваць у гарачыню прыгажосць вуснаў, лепш замяніць ліпкі бляск на лёгкую памаду пастэльнага колеру. Можна таксама выкарыстаць замест бляску спецыяльныя алеі, якія адначасова даглядаюць вусны, рэкамендуе візажыст.

**Алена ДЗЕМЯШКЕВІЧ, БЕЛТА.**

# У Маскоўскім раёне нявесты пакідаюць дзявочае прозвішча

**Нявесты пры рэгістрацыі шлюбу ўсё часцей пакідаюць дзявочае прозвішча, каб не мяняць пашпарт. Пра гэта расказала начальнік аддзела ЗАГС адміністрацыі Маскоўскага раёна Наталля Філімонава.**

Прычына ў тым, што пасля ўрачыстасці маладыя нярэдка ад'язджаюць у вясельнае падарожжа. А пуцёўкі, білеты, страхоўка куплены загадзя. Вярнуўшыся, наваспечаныя жонкі спяшаюцца ў ЗАГС, каб узяць прозвішча мужа. І такіх выпадкаў сёння шмат, адзначыла Наталля Філімонава. Усяго ж у Маскоўскім раёне за шэсць месяцаў 2010 года зарэгістраваны 114 выпадкаў перамены прозвішча, імя ці імя па бацьку (рост да аналагічнага перыяду 2009 года на 48 працэнтаў). Мянялі жыхары раёна такія прозвішчы, як Бобікава, Нямыцькава на больш мілагучныя. Некаторыя гараджане ўзялі новае імя па бацьку ў знак падзякі айчыму або апекуну.

Таксама за першае паўгоддзе 2010 года ў ЗАГСе Маскоўскага раёна зарэгістраваны 725 шлюбаў. Па-ранейшаму самымі запатрабаванымі ў маладых застаюцца жнівень і верасень. А вось ахвотных замацаваць сямейны саюз у дзень трох дзясятак (нядзеля 10 кастрычніка 2010 года) пакуль няма. Хоць ЗАГС у гэты дзень будзе працаваць.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск-Навіны».**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Судоку (9 ліпеня).**

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 7 | 4 | 5 | 3 | 2 | 8 | 1 | 9 | 6 |
| 9 | 2 | 8 | 1 | 7 | 6 | 5 | 3 | 4 |
| 6 | 1 | 3 | 9 | 5 | 4 | 8 | 7 | 2 |
| 4 | 3 | 2 | 8 | 9 | 1 | 7 | 6 | 5 |
| 5 | 8 | 7 | 4 | 6 | 2 | 3 | 1 | 9 |
| 1 | 9 | 6 | 7 | 3 | 5 | 2 | 4 | 8 |
| 3 | 6 | 9 | 5 | 8 | 7 | 4 | 2 | 1 |
| 2 | 5 | 1 | 6 | 4 | 3 | 9 | 8 | 7 |
| 8 | 7 | 4 | 2 | 1 | 9 | 6 | 5 | 3 |

**Сканворд (10 ліпеня). Па гарызанталі:** Батэрфляй. Судак. Сэт. Валан. Лік. Амбон. Стаж. Аліва. Пуга. Глісер. Клірас. Сак. Секанс. Жалеза. Агар. Лях. Купа. Пальма. Пасол. Ват. Лаг. Пояс. Школа. Лаз. Кравец. Мера. Уран. Барс. Алазані. **Па вертыкалі:** Формула. «Оскар». Пак. Кулак. Ака. Аргус. Сон. Аполак. Трус. Страла. Бар. Гламур. Ствол. Аверс. Аніс. Возера. Дол. Цана. Яга. Асака. Пта. Кант. Дама. Апіс. Ляп. Жураўель. Гак. Зямля. Спас. Даха. Скачкі.

**Сканворд (13 ліпеня). Па гарызанталі:** Самбіст. Ідал. «Атас». Сцёк. Прагул. Ашуг. Стакан. Прэс. Ліса. Купіна. Мазанік. Марш. Сала. Лак. Іванава. Радон. Увал. Заступ. Апостал. Ахун. Станок. Міса. Палас. Дранікі. Азот. Караван. Талерка. **Па вертыкалі:** Цені. Аліва. Страва. Кіса. Шкала. Пудра. Атос. Андарак. Ступа. Аста. Анан. Балаган. Аналіз. Туш. Жазло. Акот. Алупка. Сіта. Торс. Груз. «Арс». Эпас. Атам. Асіна. Духі. Ніл. Опус. Какаін. Набойка.

**Сканворд (14 ліпеня). Па гарызанталі:** Гімнастка. Народ. Сага. Тост. Ікар. Град. Куб. Лаўр. Астра. Аса. Запал. Яхтсмен. Ата. Рапс. Булат. Нязгода. Данос. Дастатак. Гай. Ода. Кляча. Капітан. Страх. Амар. Пірог. Ярына. Аул. Кар. Ага. Трэнер. **Па вертыкалі:** Бягун. Гіт. Старт. Язда. Гайка. Грамафон. Лхаса. Сет. Доля. Гена. Ананас. Чапяла. Агіда. Амір. Марак. Арыка. Акт. Крона. Дар. Гарт. Фаза. Тып. Руда. Капрал. Тот. Пасада. Бейсбаліст. Кандытар.

**Сканворд + судоку (15 ліпеня). Па гарызанталі:** Лайка. Вадарод. Ліда. Метр. Фае. Кілт. Шэйх. Акцыз. Лейбарыст. «Лад». Адэн. Эльба. Улас. Айн. «Фінансіст». Адан. Тока. Абак. Тан. Тытр. Ядловец. **Па вертыкалі:** Лабараторыя. Алібі. Лейтэнант. Крафт. Альфа. Смеш. Рабіна. Эрыдан. Баранц. Алтай. Аха. Хата. Дуст. Эліот. Наска. Дзераза. Стан. **Судоку:** адказы гл.у табліцы.

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 8 | 9 | 1 | 7 | 6 | 5 | 4 | 3 | 2 |
| 4 | 6 | 2 | 3 | 1 | 9 | 5 | 8 | 7 |
| 7 | 3 | 5 | 2 | 4 | 8 | 1 | 9 | 6 |
| 3 | 2 | 8 | 1 | 9 | 6 | 7 | 4 | 5 |
| 1 | 7 | 6 | 5 | 3 | 4 | 9 | 2 | 8 |
| 9 | 5 | 4 | 8 | 7 | 2 | 6 | 1 | 3 |
| 5 | 8 | 7 | 4 | 2 | 1 | 3 | 6 | 9 |
| 6 | 4 | 3 | 9 | 8 | 7 | 2 | 5 | 1 |
| 2 | 1 | 9 | 6 | 5 | 3 | 8 | 7 | 4 |

Тэлесеткі

# Беларусаў «зачысцяць»

**ТЭЛЕКАНАЛ АНТ абвясціў кастынг для новага экстрэмальнага рэаліці-шоу «Зачыстка». Паводле слоў прэс-сакратара канала Таццяны Курбат, гэта беларускі аналаг шоу «Жорсткія гульні», што выходзіла не так даўно на расійскім Першым канале. Увогуле ж гэты праект ацанілі ўжо тэлегледачы ў больш як 25 краінах свету.**

...Здымаецца шоу ў Аргенціне — у 40 км ад Буэнас-Айрэса пабудаваны адмысловы гарадок, дзе аматары вострых адчуванняў праходзяць шэраг эстафетаў і іспытаў — на першы погляд мо і забаўных, а насамрэч вельмі складаных: кручэнне ў цэнтрыфузе, пагружэнне пад ваду, праходжанне праз агонь, поўзанне па паласе перашкодаў з гразі і іншыя, не менш «прыемныя» іспыты. Не дзіва, што многія вельмі хутка губляюць баявы настрой і мараць толькі пра тое, каб вярнуцца дадому найхутчэй ды без траўмаў!

Нягледзячы на тое, што фармальна ўдзельнікі аб'яднаныя ў каманды, на справе кожны змагаецца сам за сябе — у гульні цэняцца не сяброўства і ўзаемавыручка, а добрая спартыўная форма, азарт, вынослівасць і стрэсаўстойлівасць.

Беларускія гульцы, расказалі на АНТ, возьмуць удзел у міжнароднай версіі праекта: цягам трох тыдняў наша каманда будзе канкурыраваць са зборнай Чэхіі і Славакіі, а таксама камандай Украіны. Гледачоў у выніку чакае дзесяць серый захапляльнага шоу, вядучымі якога абраныя Дзядзя Ваня і Саша Паўлава. Пакуль жа ідзе поўным ходам адбор кандыдатаў — усяго іх мяркуецца набраць 20 чалавек, прычым



палову каманды складуць вядомыя персоны.

Ахвотнікам пазмагацца за месца пад сонцам Аргенціны прапануецца да 10 жніўня запоўніць анкету на сайце www.ont.by (сярод яе пытанняў, напрыклад — расповед пра свае фобіі, а таксама інфармацыя аб тым, якімі відамі спорту займаўся кандыдат). Далей варта настроіцца маральна на няпростыя выпрабаванні і — чакаць, раптам удача ўсміхнецца менавіта вам?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# СВЯТА ПАЛЬМАВАЙ ГАЛІНКІ



НА Мінскім моры ўжо ў трынаццаты раз прайшлі спаборніцтвы па відсёрфінгу, удзел у якім узялі каля пяцідзесяці аматараў і прафесіяналаў гэтага воднага алімпійскага віду спорту. Нягледзячы на тое, што Беларусь з'яўляецца няводнай краінай, нашы спартсмены паспяхова паказваюць сябе на спаборніцтвах міжнароднага ўзроўню. Адразу пасля «Свята пальмавай галінкі» прафесійныя відсёрферы адправіліся на чэмпіянат свету, які будзе праходзіць з 24 па 31 ліпеня ў Францыі.

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**



# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.04 | 21.27 | 17.23 |
| Віцебск — | 4.46 | 21.24 | 16.38 |
| Магілёў — | 4.54 | 21.18 | 16.24 |
| Гомель — | 4.58 | 21.06 | 16.08 |
| Гродна — | 5.20 | 21.41 | 16.21 |
| Брэст — | 5.29 | 21.34 | 16.05 |

## Месяц

***Першая квадра 18 ліпеня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

## Імяніны

***Пр.*** *Еўдакіі, Ефрасінні, Марыі, Германа, Лук'яна, Фамы.*

*К. Чаславы, Геранімa, Ілы, Часлава.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## 20 ліпеня

Дзве даты



**1304 год** — нарадзіўся Франчэска Петрарка, славуты італьянскі паэт («Кніга песняў», «Афрыка», «Пісьмо да нашчадкаў»). Аказаў вялікі ўплыў на развіццё еўрапейскай паэзіі.

**1926 год** — пры нявысветленых абставінах раптоўна памёр Фелікс Дзяржынскі. У 12 гадзін дня Фелікс Эдмундавіч выступаў на Аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК ВКП (б) з палымянай прамовай у абарону ленінскага адзінства партыі. Праз тры гадзіны пасля выступлення Дзяржынскі памёр, па афіцыйнай версіі, ад паралiча сэрца.

Цытата дня:

***«Калі свечкі ў імянінным пірагу абышліся вам даражэй, чым сам пірог, значыць, старасць не за гарамі».***

**Боб Хоўп (1903—2003), амерыканскі комік, акцёр тэатра і кіно.**

# Абавязкі хросных бацькоў

Свет і сусвет ЧАЛАВЕКА

**Хросныя бацька і маці павінны паклапаціцца пра нацельны крыжык хрэсніка. Крыж і тасьму купляюць у храме. Тасьма павінна быць чырвонага колеру і складаць дзве даўжыні ручкі дзіцяці ад пальчыкаў да локця. На тасьму хросная маці або маці дзіцяці начытвае малітву «Ойча наш».**

● Для абраду хрышчэння шылі з новай, абавязкова белай (светлай) тканіны хрысцільны ўбор. Яго ўпрыгожвалі карункамі. Спавівальнік (пояс, якім перавязвалі дзіця пасля спавівання) павінен быць чырвонага колеру. У царкве хросная маці павінна была на працягу ўсяго абраду трымаць пялёнкі і спавівальнік, каб такім чынам «вопратка» хрэсніка таксама была асвячоная.

● Пасля таго, як дзіця тройчы апусцяць у хрысцільню з вадой, яго трэба было прыняць на белую пялёнку, якая пасля гэтага станавілася самым надзейным абярэгам для дзіцяці. Яе захоўвалі ўсё жыццё.

● Хросныя бацькі павінны набыць для хросніка «імянную» ікону — абраз святога, у гонар якога назвалі дзіця, азнаёміцца самім і распавесці хрэсніку, калі ён падрасце, жыццяпіс гэтага святога, навучыць малітвезвароту да свайго святога апекуна.

● Акрамя гэтага, ёсць малітвы, з якімі непасрэдна звяртаюцца да святога, у гонар якога названа дзіця, звяртаюцца ў гаротнасці і радасці, у хваробах і нягодах. Напрыклад, дзяўчынка па імені Ксенія павінна ведаць малітву, з якой звяртаюцца да Святой Ксеніі Пецярбургскай — апякункі сямейнага шчасця, заступніцы ўсіх няшчасных і абяздоленых (дзень ушанавання — 6 лютага).

● Пакуль хрэснік падрастае і сталее, хросныя бацькі знаходзяцца побач, дапамагаюць яго духоўнаму станаўленню, прыводзяць у храм у святы на споведзь і прычашчэнне. На працягу года існуе некалькі дзён, калі хрэснікі абавязкова прыходзяць у госці да хросных бацькоў, і калі хросныя бацькі наведваюць хрэсніка.

● Так будзе працягвацца да вяселля хрэсніка, у якім хросныя бацькі возьмуць самы актыўны ўдзел: яны стануць сватамі і будуць побач з хрэснікам у момант сватаўства, у храме падчас шлюбу, спякуць і вынесуць да вясельнага стала знак сямейнага шчасця — вясельны каравай.

● Здавалася б, узаемаадносіны хросных бацькоў і хрэсніка на гэтым павінны скончыцца. Але існуе тайнае правіла: хросныя бацькі да канца сваіх дзён моляцца за сваіх хрэснікаў, а хрэснік абавязаны праводзіць у апошні шлях сваіх хросных бацькоў.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

# Усміхнемся!

**У інтэрнаце мы елі ўсе разам з агульнай каструлі. Але таму, што я ем шмат і хутка, мне вылучалі асобную талерку.**

☺

— Скажы, як ты з такімі ведамі паступіў у ВНУ?
— Грошы ёсць, розуму не трэба!
— А адкуль у цябе грошы?!
— А сіла ёсць...

☺

**Абвестка.**
**«Вазьму ў арэнду васьмінога перад Еўра-2012».**

☺

Двое сяброў:
— Учора такую дзяўчыну бачыў: ногі ад карэнных зубоў!
— Ты яе праз 50 гадоў уяві сабе — устаўная сківіца на мыліцах.

☺

**У Расіі ўсё, што робіцца ключом менш чым на 24, лічыцца нанатэхналогіяй.**

☺

— Што з рукой?
— Кроў з пальца бралі.
— А чаму рука ў гіпсе?
— А я не даваў!




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.**
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 3490. Нумар падпісаны ў 19.30.**
**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**
**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**